ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

№ 263 (3371) Панядзелак 18 лістапада 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас ред. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

БЭРЛІН, 17. Газ. «Ротэ Фанэ» паведам, што 7 лістапада ў Кантоне адбылася вялікая рэвалюцыйная дэманстрацыя рабочых, арганізаваная кітайскай кампартыяй. Нападаўшым атрадам паліцыі дэманстранты аказвалі супраціўленьне на працягу некалькіх гадзін. Пасьля гэтага паліцыя адкрыла па дэманстрантах кулямётны агонь, у выніку чаго 12 рабочых забіта, 21 цяжка паранены.

Залатыя каштоўнасьці у фонд індустрыялізацыі

БАБРУЙСК. (Наш кар.) Агульны сход членаў групкому № 1 саюзу мэдснапрацы пастанавіў прыняць (выклік бакінскіх рабочых аб стварэньні залатога фонду індустрыялізацыі. Тут-жа на сходзе 5 членаў саюзу падпісаліся здаць свае каштоўныя залатыя і срэбраныя рэчы у фонд індустрыялізацыі.

ПАТРЭБЕН РЭЗКІ І РАШУЧЫ ПЕРАЛОМ

«Зьвязда» ня раз адзначала асаблівую важнасьць праходзячай зараз кампаніі перазаключэньня калдагавароў. Яна павінна мабілізаваць шырокія масы рабочых для выкананьня задач другога году пяцігодкі. Яна (кампанія) павінна сканцэнтраваць увагу рабочых і служачых на актуальнейшых пытаньнях нашай сапраўднасьці. **Калдагавор — двухбаковае абавязацельства** як гаспадарнікаў, так і рабочых, — вось лёзунг, пад якім праходзіць калдагаворная кампанія гэтага году.

Ясна, што кампанія такога вялікага палітычнага зьместу можа прайсьці пасьпяхова толькі **пры ўмове вельмі актыўнага ўдзелу ў ёй усіх** рабочых, усіх служачых нашых прадпрыемстваў. Гэта падкрэслена ва ўсіх дырэктывах вышэйшых партыйных і прафэсыянальных органаў.

Ліст ЦСПСБ і ВСНГБ зазначае, што не пазьней лістапада павінна быць закончана работа брыгад па праверцы выкананьня існуючых цяпер дагавароў і прыступлена да абгаварэньня вышкаў гэтай праверкі. У працягу лістапада павінна быць праведзена абгаварэньне новых дагавароў. Канечны тэрмін кампаніі — 20-га сьнежня, калі ўсе дагавары павінны быць афармлены і падпісаны.

Такім чынам, першы этап кампаніі — па пляну трэба лічыць закончаным. Аднак, ці выкананы гэты плян? Ці закончана сапраўды праверка? Якая яе якасьць? Ці прымалі сапраўды ўдзел у ёй найшырэйшыя масы?

Адказу на гэта пытаньне мы па жаль даць ня можам.

Прафсаюзы Беларусі **ня ведаюць** малюнку ходу праверкі. Інструкцыі на месцы пасланы, дырэктывы даны. Ва многіх мясцох праверка павінна была закончыцца... Вось, што дало наша апытаньне ЦП прафэсыянальных саюзаў! Больш падрабязных вестак, аказваецца, няма.

Такое становішча, калі кіраўнічыя арганізацыі ня могуць даць вычэрпваючага адказу аб фактычным ходзе важнейшай палітычнай кампаніі — зьяўляецца зусім ненармальным. Асобныя жа даныя, што ёсьць у распараджэньні рэдакцыі, сыгналізуюць **спазьненьне** кампаніі.

Так, па некаторых буйнейшых менскіх прадпрыемствах («Дрэваапрацоўшчык», «Меншвэй») **толькі зараз выдзелены праверачныя брыгады.**

ЦП саюзу рабочых паліграфвытворчасьці **толькі чатыры дні** таму назад разаслала дырэктыўны ліст.

Надрукаваная сёньня ў «Зьвязьдзе» заметка гаворыць аб слабай падрыхтаванасьці саюзу Саўгандальслужачых. На адбыўшымся 14-га лістапада сходзе старшынь фабзаўмясцкомаў менскіх прадпрыемстваў і ўстаноў саюз не завастрыў увагі на палітычны бок кампаніі. У выніку на сходзе шмат гаварылі аб драбніцах і амаль нічога аб важнейшых палітычных пытаньнях.

Дзе-ні-дзе дагавары заключаюць бюракратычна, без абгаварэньня іх рабочымі. Яскравы прыклад агідных адносін да гэтае важнейшае справы зьмяшчаўся на старонках «Зьвязды». Заўком № 1 Менскага чыгуначнага вузлу **ня склікаў нават ні аднаго сходу** для абгаварэньня прысланага з цэнтру праекту генэральнага дагавору: «У нас няма часу для правядзеньня агульных сходаў», — заявіў нашаму супрацоўніку старшыня заўкому.

Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што **патрэбен рэзкі і рашучы пералом ва ўсёй рабоце па праверцы старых і заключэньні новых дагавароў.** Трэба забясьпечыць непасрэднае кіраўніцтва вышэйшых прафэсыянальных органаў нізавымі прафэсыянальнымі ячэйкамі. Трэба забясьпечыць удзел у кампаніі шырокіх мас рабочых і служачых. Бюракратычнае, папяровае кіраўніцтва павінна зьмяніцца жывой работай на прадпрыемстве.

Перазаключэньне калдагавароў — экзамен для прафсаюзаў, праверка іх фактычнага пераходу на новыя мэтады работы. Прафсаюзы павінны вытрымаць гэты экзамен.

Усебеларускі зьезд працаўнікоў друку

Учора ўвесь дзень і часткова вечарам працягваліся спрэчкі па дакладу тав. БУДЗІНСКАГА. Прамоўцы ў сваёй пераважнай большасьці спыняліся на асноўных задачах друку ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва па выкананьні генэральнай лініі партыі, на пытаньнях барацьбы з ухіламі ад ленінскай лініі партыі.

На зьезьдзе мела месца нацыянал-дэмакратычнае выступленьне В. Ляшэвіча, якое сустрэла аднадушнае асуджэньне і жорсткі адпор з боку ўсяго зьезду.

На вячэрнім пасяджэньні зьезд заслухаў заключнае слова т. Будзінскага і справаздачу т. ЛАЗАРА аб дзейнасьці ЦБ сэкцыі працаўнікоў друку СССР.

Аўстрыйскія сац.-фашыстыя адкрыта пераходзяць у лягэр фашызму

За міністэрскія партфэлі ў фашысцкім габінэце АБЯЦАЮЦЬ „НЕ ЗАЙМАЦЦА САЦЫЯЛІЗМАМ“

ВЕНА, 15. Пасьля таго, як у парляманцкай падкамісіі па канстытуцыйных справах закончылася першая чытка высунутых прэм'ерам Шобэрам праектаў рэформы канстытуцыі, Шобэр пачаў перагаворы з прадстаўніком сацыял-дэмакратычнай фракцыі Данэбэргам в мэтаю дасягнуць згоды па пунктах, якія заставаліся яшчэ спрэчнымі. У лік гэтых спрэчных пунктаў уваходзіць пытаньне аб будучым адміністрацыйным становішчы Вены, аб так званым законе супроць тэрору, аб надзвычайных паўнамоцтвах прэзыдэнта і г. д.

Большасьць буржуазных газэт замоўчвае вынікі гэтых перагавораў. Сацыял-дэмакратычны друк у правінцыі, наадварот, **адкрыта дае зразумець аб тым, што перагаворы гэтыя скончыліся паразуменьнем.**

Між тым, хэймвэр дамагаецца хутчэйшага ажыцьцяўленьня рэформы канстытуцыі, пры чым супярэчыць супроць якіх-небудзь значных зьмен **першапачат ковай рэдакцыі** праекту рэформы. На парадзе хэймвэрыстых у Інсбруку лідэр хэймвэру Штэйдле заявіў, што **хэймвэр разбройца толькі тады, калі атрымае поўную перамогу,** а да гэтага часу хэймвэр ня выпусьціць зброі з рукі і будзе ўсімі сродкамі бязьлітасна змагацца за свае мэты, **ня лічачыся з рамкамі законнасьці.**

Сац.-фашыстыя хваляцца сваімі заслугамі ў барацьбе супроць дыктатуры пралетарыяту

ВЕНА, 15. Учарайшыя спрэчкі па бюджэце 1930 году ў фінансавай камісіі аўстрыйскай нацыянальнай рады прайшлі пад знакам узаемных прымірэнцкіх спроб буржуазных партый і сацыял-дэмакратаў. Сац.-дэмакраты, стараючыся схіліць буржуазныя партыі да кампрамісу, **хваліліся сваімі заслугамі ў якасьці самых сур'ёзных праціўнікоў дыктатуры пралетарыяту.**

Дрэксэль заявіў, што ў Аўстрыі «адсутнічае моцная масавая камуністычная партыя». Гэта, па словах Дрэксэля, зьяўляецца **бясспрэчнаю заслугаю сацыял-дэмакратаў, якія** патрафілі ўтрымаць свае арганізацыі непарушнымі, **ня гледзячы на галечу, беспрацоўе і роспач рабочых.**

Далей сац.-дэмакрат Рэнэр намякнуў што сацыял-дэмакраты гатовы прыняць удзел у каалыційным габінэце і запэўніў буржуазную большасьць парламенту, што аўстрыйскія сац.-дэмакраты, у выпадку, калі яна будзе дапушчана да ўдзелу ва ўрадзе, адмовіцца ад усялякіх спроб праводзіць сацыялістычную палітыку. Рэнэр давядзіў гэта цытатамі з прамовы Отта Баўэра на апошнім зьездзе сацыял-дэмакратычнай партыі.

Далей Рэнэр называў вар'яцкімі і сьмешнымі запэўненьне некаторых буржуазных колаў, быццам аўстра-марк сызм зьяўляецца «фарпостам Масквы». **«Усім вядома,**—заявіў Рэнэр,—заядлая і жорсткая тэарытычная барацьба Масквы з Отта Баўэрам. Масква змагаецца з аўстра-марксызмам, як з няпрыміручым ворагам.

Адзіны фронт нямецкіх і аўстрыйскіх сац.-здрадніка ў барацьбе з рэвалюцыйным рухам

БЭРЛІН, 12. У правай нямецкай прэсе ў апошнія дні зьявіліся паведамленьні аб тым, што паміж нямецкім сац.-дэмакратычным саюзам імперскага сьцягу і аўстрыйскімі сац.-дэмакратычным саюзам рэспубліканскай абароны заключана згода аб супольнай дзейнасьці на выпадак сур'ёзных хваляваньняў у Аўстрыі.

З гэтай прычыны «Бэрлінэр Берэзн-Цэйтунг», спасылаючыся на аўтарытэтныя колы, заяўляе, што безадкладна пасьля ўзьнікненьня якіх-небудзь сур'ёзных хваляваньняў у Аўстрыі, аўстрыйска-нямецкая граніца з боку Нямеччыны будзе зачынена.

Новы суровы закон аб друку

ВЕНА, 15. Юрыдычная камісія парляманту 14 лістапада прыступіла да абгаварэньня новага праекту палажэньня аб друку. Новы праект прадугледжвае больш суровыя кары за злачынствы ў прэсе і ўвядзеньне папярэдняй цэнзуры.

Згодна праекту, зьнявага прыватных асоб у прэсе караецца арыштам на тэрмін ад 1 да 6 месяцаў.

Зьнявага аўстрыйскага прэзыдэнта, законадаўчых органаў, арміі, членаў парляманту і абшчынных рады, дзяржаўных служачых, афіцэраў, салдат і духоўных асоб караецца зьняволеньнем на тэрмін ад 6 да 12 месяцаў.

Да гэтага часу абавязковы экзэмпляр кожнага твору прэсы пасылаўся пракуратуры адначасова з выпускам выданьня ў сьвет. Праект зьмяняе гэта правіла і дазваляе выпуск выданьня ў сьвет толькі пасьля таго, як абавязковы экзэмпляр паданы пракуратуры.

Рабочы рух у краінах белага тэрору

Швэдзкія рэфармістыя прадаюць рабочых-лесарубаў

Напярэдадні забастоўкі 15 тысяч лесарубаў

Міжнародны камітэт прапаганды і дзейнасьці рэвалюцыйных сельска-гаспадарчых і лясных рабочых атрымаў весткі аб нарастаючым буйным качфлікце паміж швэдзкімі лесапрамысловцамі і рабочымі лесарубамі і сплаўшчыкамі на вэртляндзкіх і далікралійскіх лесараспрацоўках. Тэрмін старога калдагавору, які ахоплівае да 15 тыс. лесарубаў і сплаўшчыкаў, мінуў яшчэ 1 верасьня. Доўгія перагаворы аб заключэньні новага калдагавору гэтымі днямі перарваны, з прычыны ўпартага нежаданьня лесапрамысловцаў здаволіць справядлівыя патрабаваньні рабочых аб увядзеньні ў новы калдагавор раду пунктаў, якія паляпшаюць агульныя ўмовы работы на лесараспрацоўках. Разыходжаньні гуртуюцца, галоўным чынам, вакол пытаньняў зарплаты.

Вельмі магчыма, што ў бліжэйшы час **канфлікт завострыцца і прывядзе да адкрытай барацьбы лесарубаў з прамысловцамі.**

Дзяржаўны пасярэднік Эклом энэргічна працуе для дасягненьня «прымірэньня» бакоў. У тым-жа кірунку «працуюць» і рэфармісцкія правадыры.

Агідныя ўчынкі румынскай паліцыі

ВЕНА. Унітарная рада прафсаюзаў у Румыніі пачала нядаўна збор ахвяраваньняў на карысьць сем'яў забітых у часе расстрэлаў гарнякоў у Лупэнах. За некалькі дзён да сьвяткаваньня 12-й гадавіны Кастрычніка ў Лупэны прыбыла дэлегацыя, якая прыступіла да разьмеркаваньня сабраных грошай, аднак, 6-га лістапада дэлегаты-рабочыя унітарыстыя былі арыштаваны і знойдзеныя пры іх грошы канфіскаваны. Арыштаваныя абвясьцілі галадоўку.

Забастоўка гарнякоў у Вэнгрыі пашыраецца

ВЕНА, 15. Паводле паведамленьняў з Будапэшту забастоўка горнарабочых у Шальдэтар'яне, якою кіруе левае рэвалюцыйнае крыло прафсаюзаў, працягвае разрастацца. Рэфармісцкая прафсаюзная бюракратыя прабуе сарваць забастоўку і пачаць «паразумевальныя перагаворы» з капальняўласьнікамі. У сваёй барацьбе супроць забастоўкі рэфармістыя ня спыняюцца нават перад даносамі. Аднак гэтыя спробы церпяць пакуль што няўдачу. Жандармэрыя ў Шальдэтар'яне робіць масавыя вобыскі і арышты. Адміністрацыя капальняў, у адказ на забастоўку, абвясьціла лёкаўт і з дапамогаю жандараў высяляе рабочых з іх кватэр.

«Мад'яр Шак» у паведамленьні, інсьпіраваным паліцыяй, заяўляе, што масавыя арышты тлумачацца тым, што ў Шальдэтар'яне і іншых вугліпрамысловых раёнах наглядаецца масавае распаўсюджваньне камуністычных лятучак, якія заклікаюць рабочых абярнуць забастоўку ва ўсеагульную забастоўку гарнарабочых усёй Вэнгрыі.

Калёніяльная палітыка „рабочага“ ўраду ў Афрыцы

Паліцыя пры дапамозе бомб, кулямётаў і газаў зьдзірае падаткі

ЛЁНДАН, 14. Хваляваньні сярод туземцаў у Паўднёвай Афрыцы прымаюць шырокія разьмеры і выклікаюць трывогу ў афіцыйных колах. Цэнтрам хваляваньняў зьяўляецца порт Дурбэн, найбольш буйная гавань на ўсходняафрыканскім узьбярэжжы правінцыі Наталь. Вялізарная дэманстрацыя пратэсту супроць ангельскага панаваньня адбылася нядаўна ў цэнтры Трансвальскага золатапрамысловага раёну, і ў Іогансбургу. Дэманстрацыі туземцаў па ўсім Паўднёва-Афрыканскім саюзе чакаюцца 15 сьнежня ў дзень Югаана (дзень нацыянальнае жалобы ў туземцаў).

Шырока праводзіцца сярод туземцаў кампанія за нявыплату падушнага падатку. Фактычна з сакавіка месяца спынілася паступленьні гэтага падатку.

Як падае агэнцтва «Рэйтэр», паліцыя будзе рабіць аблаву па туземцаў з мэтаю спраўджаньня аплаты падушнага падатку. У выпадку-ж супраціўленьня паліцыя гатова прыняць належныя меры. Як водзіцца, кансэрватыўны ангельскі друк абвінавачвае ў гэтых хваляваньнях Камінтэрн.

ЛЁНДАН, 15. **Хваляваньні ў Дурбэне працягваюцца. Белая паліцыя, узброеная вінтоўкамі, кулямётамі і бомбамі, якія выклікаюць сьпёзацячэньне, акружыла баракі туэмцаў.** Туземцы, большасьць якіх зьяўляецца докэрамі, прапускаліся па аднаму праз паліцэйскі кардон, які дамагаўся прад'яўленьня квітка аб уплаце падушнага падатку. 600 чалавек, якія аказаліся бяз квітка, былі арыштаваны і бязадкладна адданы пад суд.

У той час, як арыштаваныя накіраваліся да вызначанага ім зборнага пункту, **паліцыя разганяла туземцаў-рабочых,** што сабраліся вакол арыштаваных, **кідаючы бомбы, якія выклікалі сьпёзацячэньне.**

Галадоўка палітвязьняў у Фінляндыі працягваецца

БУРНЫЯ МІТЫНГІ ПРАТЭСТУ АДБЫВАЮЦЦА ПА ЎСЁЙ КРАІНЕ

ГЭЛЬСІНГФОРС, 14. Хваляваньні, выкліканыя галадоўкай палітычных зьняволеных у Экэнэскай катаржнай турме, узмацняюцца. Па ўсёй краіне наладжваюцца рабочыя мітынгі пратэсту, на якіх прымаюцца рэзалюцыі з патрабаваньнем вызваленьня палітычных зьняволеных. Рабочыя сходы ў Выбаргу і Тамэрфорсе скончыліся сутычкай з паліцыяй, якая напала на рабочых у конным страі і зьбівала дэманстрантаў. Палітычныя зьняволеньня ў турмах Або і Тавастгуста абвясьцілі галадоўку ў знак салідарнасьці з экэнэскімі палітказтаржанамі. Буржуазны і сацыял-дэмакратычны друк стараецца замазаць факт масавага руху пратэсту, выкліканага галадоўкай палітзьняволеных, пры гэтым спасылаецца на «руку Масквы». (ТАСС).

***

ГЭЛЬСІНГФОРС, 15. Галадоўка палітычных зьняволеных у Экэнэскай катаржнай турме працягваецца. Як паведамляе фінляндзкае агэнцтва, рэвалюцыйныя прафсаюзы зьвярнуліся з адозвай да ўсіх фінскіх рабочых, заклікаючы іх правесьці 16 лістапада забастоўку салідарнасьці з палітзьняволенымі. Галадоўка палітзьняволеных у турме Або і Тавастгуста, абвешчаная ў знак салідарнасьці з палітказтаржанамі, працягваецца. (ТАСС).

***

ГЭЛЬСІНГФОРС, 14. Канфіскаваны рэвалюцыйны орган «Паведамленьні рабочых арганізацый» за апублікаваньне матар'ялаў аб галадоўцы палітзьняволеных Экэнэскай турмы.

ПЛЕНУМ ЦК УсеКП(б)

(Інфармацыйнае паведамленьне)

МАСКВА. 17 лістапада адбыўся пленум Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б). Пленум разглядзеў наступныя пытаньні:

1) Дырэктывы аб кантрольных лічбах народнае гаспадаркі на 1929-30 г.;

2) Вынікі і далейшыя задачы калгаснага будаўніцтва.

3) Даклад ЦК КП(б)У аб рабоце ў вёсцы;

4) Аб саюзным Наркамземе;

5) Аб выкананьні пастаноў ліпеньскага пленуму ЦК па падрыхтоўцы тэхнічных кадраў.

Акрамя гэтага, пленум разглядзеў пытаньне аб групе правых ухілістых (група т. Бухарына).

Выходзячы з рашэньня пленуму ВККІ і бяручы пад увагу, што лідэры вывадзе яго са складу прэзыдыума ВККІ, бяручы пад увагу, што лідэры правых ухілістых (т. т. Бухарын, Рыкаў, Томскі) не адмовіліся ад сваіх памылак,—пленум пастанавіў вывесьці т. Бухарына, які зьяўляецца ідэалёгам правага ўхілу, са складу палітбюро ЦК УсеКП(б). Рэшце-жа таварышоў зрабіў папярэджаньне ў тым, што ў выпадку найменьшай спробы з іх боку працягваць барацьбу супроць лініі і рашэньняў ЦК УсеКП(б)—партыя неадкладна прыйме супроць іх арганізацыйныя захады.

Члены ЦК—т. т. Котаў, Міхайлаў, Угланаў і Кулікаў заявілі пленуму аб сваім разрыве з правымі ўхілістымі.

Пленум намеціў скліканьне чарговага партыйнага зьезду на май 1930 году.

Пленум пастанавіў увясьці тав. ГАМАРНІКА ў склад аргбюро ЦК УсеКП(б) і т. ШВЭРНІКА—кандыдатам аргбюро ЦК УсеКП(б).

З-я пазыка індустрыялізацыі павінна быць рэалізавана поўнасьцю

(ГУТАРКА З НАРКАМФІНАМ СССР тав. Н. І. БРУХАНАВЫМ

Нарком фінансаў Саюзу т. Н. І. Бруханаў у гутарцы з супрацоўнікам ТАСС заявіў:

— За параўнальна кароткі тэрмін **падпіска на пазыку абагнала першапачаткова вызначаную суму, дасягнуўшы на сёньняшні дзень 815 млн. руб.**

Урад дазволіў дадатковы выпуск 3-й пазыкі індустрыялізацыі на 150 млн. рублёў, з давядзеньнем усяе сумы да 900 млн. руб. У сувязі з гэтаю пастановай, ніякія паўторныя і дадатковыя падпіскі сярод працоўных, ужо раней падпісаўшыхся на пазыку, абсалютна недапушчальны. Дадатковая сума пазык павінна быць галоўным чынам, пакрыта за рахунак сялянства і неахопленай часьці рабочых і служачых.

Да гэтага часу агульная сума падпіскі сярод сялянства дасягнула 136,5 млн. руб., г. зн. каля $^2/_3$ першапачатковага заданьня. Між іншым, у сувязі з павялічэньнем сумы пазыкі, плян падпіскі ў вёсцы павялічаны на 20 проц. і складае суму ў 240 млн. руб. Пры наяўнасьці вялізных грашовых паступленьняў у сувязі з рэалізацыяй хлеба і значных заработкаў у сялянства, па-за гаспадаркаю, выкананьне гэтай сумы, бязумоўна, пасільная задача. Трэба толькі рагарнуць шырока работу грамадзкасьці, мабілізаваць усю энэргію і сілу фінансавага і крэдытнага апарату, нанесьці рашучы ўдар кулацкай контрагітацыі, і тады мы з гэтаю задачаю справімся.

Больш актыўнага ўдзелу ў працы МОПР'у з боку партыйных, прафэсыйных і камсамольскіх арганізацый

Усесаюзны агляд ячэек МОПР'у

Пачаўся ўсесаюзны агляд ячэек МОПР'у, які працягнецца лістапад і сьнежань месяцы.

Для таго, каб зразумець мэты і задачы, якія высоўваюцца аглядам, даволі прачытаць дырэктыўны ліст АПАД ЦК КП(б)В па гэтым пытаньні. У гэтым лісьце, які разасланы ўсім рэдакцыям цэнтральных і абласных газэт, досыць ясна гаворыцца.

1) Узмацніць увагу партыйных, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый і ўсёй савецкай грамадзкасьці па пытаньні аб МОПР'ы і на пастаноўцы рэгулярнай і сыстэматычнай работы па інтэрнацыянальным выхаваньні працоўных мас гораду і вёскі.

2) Выяўленьне сапраўднага стану работы нізавых ячэек МОПР'у як у горадзе, так і на вёсцы і якаснага паляпшэньня іх работы, забясьпечыўшы ў іх належнае парткіраўніцтва.

Мы пакуль што спынімся на гэтых двух момантах. Наша нізавая ячэйка МОПР'у як у горадзе, так і на вёсцы знаходзіцца ў такім становішчы, што ў лепшым выпадку яна праводзіць нейкую працу ў часе кампаніі. Работа нізавой ячэйкі МОПР'у гэта работа ад часу да часу, а не работа сыстэматычная. Мы павінны дабіцца якаснага паляпшэньня работы нізавой Мопраўскай ячэйкі, памятаючы, што, калі нізавая ячэйка добра працуе, дык добра працуе ўся арганізацыя і наадварот, калі нізавая ячэйка слабая, дык тады і ўся арганізацыя працуе слаба. Мы павінны ўзьняць работу нізавых ячэек, раскіданых па ўсіх гарадох і мястэчках БССР, на больш высокую ступень з тым, каб гэтым самым замацаваць інтэрнацыянальнае выхаваньне працоўных мас гораду і вёскі і дабіць той антысэмітызм, нацыянал-дэмакратызм і шавінізм розных колераў, з якімі, на жаль, сустракаемся яшчэ і сярод рабочых.

У шчыльнай сувязі з гэтай задачай—узмацненьне работы нізавой ячэйкі МОПР'у, нам трэба ўзьняць увагу ўсёй савецкай грамадзкасьці да пытаньняў работы МОПР'у. Мы дагэтуль чуем на ўсіх пленумах, канфэрэнцыях, нарадах, сходах аб тым, што ў некаторых мясцох фабкомы, і мясцкомы ня толькі не дапамагаюць у рабоце МОПР'у, але часта нават тармозяць яе. Тое самае наглядаецца з боку некаторых парт'ячэек, райкомаў партыі і асобных камуністых. Трэба адзначыць, што ў гэтым вінаваты ў першую чаргу нашы мопраўскія арганізацыі, якія дагэтуль нічога не рабілі, каб праверыць, як выконваюцца даныя дырэктывы ЦСПСБ аб дапамозе ў рабоце МОПР'у.

Трэба памятаць, што справа МОПР'у — агульная наша справа, у якой мы павінны быць зацікаўлены ўсе аднолькава.

Сакратар ЦК МОПР'у БССР
М. КАЛМЫК.

Усесаюзны агляд ячэек МОПР'у

Усесаюзны агляд ячэек МОПР'у зьяўляецца мерапрыемствам, бязумоўна, сваячасовым. Гэты агляд павінен значна павялічыць рады МОПР'у БССР.

Усесаюзны агляд ячэек МОПР'у павінен палажыць пачатак рэгулярнай і сыстэматычнай рабоце па інтэрнацыянальным выхаваньні працоўных мас гораду і вёскі, **праз шматтысячныя ячэйкі МОПР'у, і тым самым яшчэ мацней выкарчоўваць рэшткі антысэмітызму, шавінізму, нацыянал-дэмакратызму ў нашай савецкай рэспубліцы.**

Сакратар АК КП(б)Б СЛАВІНСКІ.

Усесаюзны агляд ячэек наложыць канец няўважлівым адносінам да працы МОПР'у

Пастанова належнай работы па выхаваньні прафсаюзных мас у напрамку **рэвалюцыйнага пралетарскага інтэрнацыяналізму — асноўная наша задача.**

Мы патрабуем ад усіх прафсаюзных арганізацый і іх кіруючых органаў выкананьня дырэктывы ЦСПСБ аб дапамозе МОПР'у ў яго працы, памятаючы, што МОПР зьяўляецца школай інтэрнацыяналізму.

Усесаюзны агляд ячэек МОПР'у **павінен пакласьці канец няўважлівым адносінам да работы МОПР'у з боку некаторых прафсаюзных арганізацый.**

Старшыня ЦСПСБ РЫЖКОЎ.

Усесаюзны агляд ячэек зробіць камсамолію застрэльшчыцай у найлепшай працы МОПР'у

Праз МОПР камсамолія і ўся рабочасялянская моладзь павінны цясьней зьвязацца з міжнародным рэвалюцыйным пралетарыятам і паднявольнымі прыгнечанымі народамі, з іх барацьбой за сусьветны камунізм.

Усесаюзны агляд ячэек МОПР'у зробіць нашу камсамолію застрэльшчыцай у пастаноўцы найлепшай працы ячэек МОПР'у ў горадзе і на вёсцы.

Сакратар ЦК ЛКСМБ ГАЛАВАЧ.

МОПР—важны фактар на фронце культуры

У часе правядзеньня ўсесаюзнага агляду ячэек МОПР'у ўсім асьветнікам трэба ўясьніць сабе, што МОПР зьяўляецца вельмі важным фактарам на фронце культурнай рэвалюцыі. Кожны асьветнік павінен прымаць актыўны ўдзел у працы МОПР'у.

Старшыня ЦП саюзу працасьветы РЫЧЫКОЎ

У фашысцкай Польшчы

ШУЛЕРСКАЯ ГУЛЬНЯ УНДО

Наймі польскага фашызму занепакоены ўзростам сымпатый да СССР сярод працоўных Зах. Украіны

ВАРШАВА, 16. Кракаўскі «Кур'ер Цодзенны» паведамляе, што украінскі клюб Ундо (Украінскае народна-дэмакратычнае аб'яднаньне) прыняў рэзалюцыю пратэсту супроць «тэрору», які нібы-та, праводзіцца на тэрыторыі УССР супроць украінскіх дзеячоў. У рэзалюцыі паказваецца, быццам, «камуністычная дыктатура пачала чарговы паход супроць украінскай інтэлігэнцыі, з мэтаю задушэньня украінскага вызваленчага руху».

Украінская газэта «Рада» называе гэта выступленьне Унда ў абарону, нібыта, «тэрарызаванай украінскай інтэлігэнцыі ў СССР», шулерскай гульнёй. Толькі такія ненапраўдныя шулеры, як Ундаўцы,—піша газэта, — могуць распаўсюджваць хлусьню аб тэроры, калі на самай справе арыштавана некалькі украінскіх інтэлігэнтаў, каторыя арганізавалі на чале з Якомавым контррэвалюцыйную групоўку, якая мела сувязь з заграніччымі контр-рэвалюцыянэрамі, у тым ліку з Андрэем Лівіцкім і генэралам Сальскім». «Рада» запэўняе, што украінскае насельніцтва Заходняй Украіны аддае сабе поўную справаздачу ў тым, якія пляны Ундаўскіх фашыстых. Газэта падкрэсьлівае, што нават сярод саміх Ундаўскіх дэпутатаў палавіна галасавала супроць прапановы пачаць анты - савецкую кампанію, праяўленьнем якой зьяўляецца Ундаўскі пратэст.

Рэвалюцыйны пралетарыят Польшчы---за абарону СССР

ВАРШАВА, 16. 14 лістапада адбылося пасяджэньне камфракцыі польскага сойму, на якім прынята прывітальная рэзалюцыя ад імя польскіх рабочых да пралетарыяту Савецкага Саюзу з прычыны 12-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. У рэзалюцыі адзначаецца, што авангард польскага пралетарыяту адае сабе справаздачу ў тым, што міжнародная буржуазія рыхтуецца узброенай сілаю задушыць бацькаўшчыну міжнароднай рабочай клясы—СССР. Польскія рабочыя таксама добра разумеюць пра тую ролю, якая вызначаецца ў гэтай справе Польшчы. Камуністычныя дэпутаты сумесна з рэвалюцыйным пралетарыятам прымуць усе мер да таго, каб не дапусьціць узброенага нападу на СССР. (ТАСС).

Прадпрыемца застрэлілі рабочага

У Варшаве ўласьнік пякарні Вавжынец Новак застрэліў рабочага Максымільяна Весялоўскага.

Забойца тлумачыць свой учынак самаабаронай. На справе-ж, як высьвятлілася, злачынства зроблена пры іншых абставінах.

Арганізацыя рабочых пякарань спраўджала прадпрыемствы, а іменна ў якіх умовах адбываецца там работа ноччу. Некалькі пякароў, сярод якіх дзелю праводзілі інспэкцыю пякарні Новака. І знайшоўшы начную работу у надзвычайна дрэнных антысанітарных умовах, зьвярнулі на гэту ўвагу гаспадара.

Разьюшаны гаспадар пякарні — Новак схапіў са сьцяны дубальтоўку і выстраліў у галаву Весялоўскага. Апошні раніцаю памёр у шпіталі, ня прыйшоўшы да прытомнасьці.

Арыштаваны забойца выдае а сябе

Забастоўка ў „Друкарні польскай“

Ад 11-XI у «друкарні польскай» працягваецца забастоўка. Прычыны наступныя:

Яшчэ паводле ўмовы з 1928 г., у друкарні павінна быць павышана зарплата, але да часу забастоўкі адміністрацыя пад пагрозаю звальненьняў не праводзіла ў жыцьцё названае ўмовы; не захоўваўся 8-гадзінны рабочы дзень, у машынным аддзяленьні, напрыклад, працавалі сыстэматычна па 14-15 гадзін, нават без звышгэрміновай аплаты; машыністым не аплачвалі за абслугу апарату саманакладаў; лінатыпістым павялічаны працоўны дзень на 1 гадзіну і інш.

Свае гэтыя мерапрыемствы адміністрацыя тлумачыць «рацыяналізацыяй».

Рабочыя высунулі патрабаваньне, якое складаецца з 16 пунктаў.

Гэта ўжо трэцяя забастоўка ў друкарні на працягу параўнаўча кароткага часу. («Раб.», № 329).

ЗАБАСТОЎКА НА ВАРШАЎСКІХ ФАБРЫКАХ МАКАРОНАЎ

Забастоўка на варшаўскіх фабрыках макаронаў працягваецца. Спробы фабрыкантаў пусьціць у рух фабрыкі пры дапамозе штрэйкбрэхэраў, дзякуючы ўстойлівасьці забаставаўшых, сарваны.

ЗАБАСТОЎКА НА ФАБРЫЦЫ «ШЛЕНКЕР, ВЫДЖГА І ВЭЙЭР»

13-XI, на грунце нізкай аплаты працы выбухла забастоўка на варшаўскай тутнёвай фабрыцы «Шленкер, Выджга і Вэйэр». Фабрыканты на паразуменьне не пайшлі. Рабочыя парашылі цьвёрда дамагацца задаваленьня сваіх патрабаваньняў. («Раб.», № 329).

АНТЫСЭМІЦКІЯ ХВАЛЯВАНЬНІ Ў КРАКАЎСКІМ УНІВЭРСЫТЭЦЕ

ВАРШАВА, 15. У Кракаўскім унівэрсытэце 2-гі дзень працягваюцца антысэмітскія хваляваньні. Польскія студэнты-шавіністыя зьбілі некалькіх студэнтаў-яўрэяў. Урад у сувязі з хваляваньнямі награжае закрыцьцём Кракаўскага

Крызіс тэкстыльнай прамысловасьці ў Лодзі

Беспрацоўе расьце

ВАРШАВА, 15. З Лодзі атрыманы трывожныя весткі аб становішчы рабочых тэкстыльнай прамысловасьці. За апошнія тыдні зьвольнена 1.900 новых рабочых. Рост беспрацоўя ў Лодзі зьвязаны таксама са спыненьнем (у сувязі з наступленьнем халадоў) грамадзкіх работ, на якіх былі заняты каля 2.000 рабочых. Па меры паглыбленьня крызісу ўзмацняецца і наступленьне прамысловцаў на тэкстыльны пралетарыят. Саюз прамысловцаў катэгарычна адхіліў патрабаваньні прафсаюзаў тэкстыльшчыкаў склікаць рэгам з прадпрыемцамі нараду для абмеркаваньня пытаньняў аб захоўваньні норм заработнай платы, а таксама патрабаваньне саюзу не звальняць рабочых дэлегатаў.

Уводзіцца закон аб забароне забастовак

ВАРШАВА, 15. Польскае міністэрства працы распрацоўвае праект закону аб прымусовым арбітражы ў канфліктах па пытаньні аб заработанай плаце. Фактычна новы праект зьяўляецца юрыдычным афармленьнем **забароны абвяшчаць забастоўкі** пад пагрозаю судовай адказнасьці. Характэрна, што ППС, якая на словах абвясьціла вайну ўраду, ня высунула покуль ні аднаго супярэчаньня супроць падрыхтаванага замаху на права забастоўкі. (ТАСС).

Антысавецкая кампанія польскага друку

ВАРШАВА, 16. Пасьля некаторага перапынку, «Кур'ер Паранны» аднавіў спыненую анты-савецкую кампанію. Газэта, пачынаючы ад учарайшага дня, зьмяшчае агідныя артыкулы з «выкрыцьцямі» дзейнасьці паўнамоцнага прадстаўніцтва СССР у Бэрліне. Таго-ж гатунку «выкрыцьці» друкуе адначасова таксама і «Кур'ер Цодзенны». «Выкрыцьці» гэтых газэт бясспрэчна выходзяць з аднае крыніцы.

ПАРАЗУМЕНЬНЕ «СЯЛЯНСКІХ ПАРТЫЙ»

ВАРШАВА, 9. Нарада трох «сялянскіх партый»—«Вызваленьня», «Сялянскае партыі» і «Пяста» (усе тры зьяўляюцца прадстаўнікамі інтарэсаў кулацкае верхавіны ў польскай вёсцы) пастанавілі стварыць сталы супольны камітэт для ўзгадненьня выступленьняў у сойме і на правінцыі. («Работнік»)

Ініцыятары паразуменьня выстаўляюць у якасьці

Вакол Эўропы на параходзе

Горад мінулага

(АД НАШАГА СПЭЦКОРА)

Пакінулі Новарасійск. Зьнікаюць на гарызонце абрысы берагоў. Горы садзяцца ў ваду і паволі апускаюцца. Вось яго немагчыма разглядзець іх няўзброеным вокам.

Параход «Курск» расьсякаў хвалі Чорнага мора. Нядаўняе шуміўае, сумлівае берагавое жыцьцё зьмянілася разнай работай мэханізму гадзіньнікі.

Усё ўзважана, падлічана, усё падведзена дакладным, даўно вядомым законам. У сваім прасторным «пузе» «Курск» нясе 20.000 бочак цэмэнту з ленінградзкага будаўніцтва, гліцэрын і цукар — для Англіі і Нямеччыны. У Александрыі нас чакае каштоўная ліцэцкая бавоўна. У Боне (французкая гавань) партыя коркаў. 8 тысяч тон вугалю коштам ва многа соцень тысяч долараў. Патрэбна цьвёрдая рука і пільнае вока, каб даставіць усё гэта ўцалку і ў час. Пакрытыя волавам бочкі з сінім маслам. Жмуты ачосаў, мяшкі рагамі. Вось — дырэктыва аб павышэньні экспарту дробных тавараў у Японсьці. Мы яшчэ не навучыліся карыстоўваць «адкіды» вытворчасьці. У нямецкі ачосы пойдуць для трыкажу, рогі — на грабянцы, сівушнае сала — для гарэлачных вырабаў. Яны заплацяць нам за «адкіды» валютай.

Больш такіх «адкідаў» за мяжу! Асабліва пераконваешся ў важнасьці такога дазволу, калі бачыш прасторную палубу, у тры паверхі, устаўленую скрынямі і пакупкамі з кляймом «Разное. Торг».

* * *

Гвардзейская прыплюснутая шапка з чырвоным акольшкам. Асіны стан, загнуты ў шэры мундзір прускага ўзору. На твары сьвядомасьць высокай адпаведнасьці, усклаўденай на яго за канстантынопальскі паліцэйскі чын. Пасьць «чын» правярае мараходныя кніжкі, параўноўвае фатаграфічныя карткі, дае прапускі на бераг (даволі складная працэдура з пераздыманьнем фарфіні, якая цягнецца ад 2 гадз. да суткі, у залежнасьці ад узнагароды, якую вы можаце пасуліць «чыну»), два матросы бесьперастанку снуюць вакол парахода, яны то адпльваюць на саманую адлегласьць, то падыходзяць блізка, што вы можаце вольна пераговарвацца з іншымі «чынамі» ў форме і ў штацкім, далікатна прыкамандзіраванымі да вас канстантынопальскай рэфэктурай.

Трэпце, на вашым пашпарце краіна дазвольная пячатка. Вы — свабодны. Можаце зыйсьці на бераг. Вы маеце карыстацеся далікатнасьцю «чына». І адразу-ж нагружаецеся з галавой ў какафонію няўяўных гукаў. Вы ашаны. Памножце Сухараўку 1919 году на Смаленскі рынак і вы атрымаеце прыблізнае (толькі прыблізнае) уражаньне аб партовым квартале Канстантынопалю. Для таго, каб сагнаць з пазіцыі «Курску» 2 дзесяткі прадстаўнікоў гэтага кварталу, патрэбен быў пажарны шлянг. Ну, а тут іх тысяч восемнаццаць.

Мы — я і памочнік капітана — найялі таксі. У нашым распараджэньні цэлы дзень. Прыпынак у Канстантынопалі нядоўгі: час патрэбны для бункіроўкі і куплі харчоў.

— З чаго-б нам пачаць? — зьвяртаюся да свайго спадарожніка, які ўжо цяпер дзьвярцы таксі.

— На самой справе з чаго пачаць?— думаўся памочнік. Ён бываў у Канстантынопалі ня раз. Добра знаёмы з гарадам і цяпер разважае, што-б мне сказаць у першую чаргу.

Усе, хто прыяжджае з Расіі, пачынаюць з савецкага консульства.

Як па камандзе, мы паварочваемся.

— Давайце, адвязу вас у консульства... Пазнаёмцеся...

Гаворыць шофэр на расійскай мове, спакойным, роўным, бесстароннім, ніадна ня выказваючым голасам, пажылы, ніль стары чалавек з памятным, гладка галеным тварам.

Белагвардзеец, напэўна былы ўраншэўскі афіцэр. Многа іх засталося тут фэрамі, лёкаямі, швайцарамі. Канстантынопаль — першы этап белагвардзейскага «выхаду» з Крыму, так скажуць, перасыльны пункт эміграцыі. Тыя, каго засталося грошы, выехалі, шмыгнулі ў Бэрлін, Парыж; вышэйшыя чыны-нікі і вайсковыя тузы расьсяліліся ў Паўднёвай Славіі і Баўгарыі, а «дработа», «разьменная манэта», больш гарнае мяса, кінутае на марнае жыцьцё генэраламі, засталося гнісьці ў Канстантынопалі, у праклятым галіпалійскім канцэнтрацыйным лягеры...

Мы хутка пашлі да другога аўтамабіля. Усьлед за намі пачулася брудная лянка. Шофэр - белагвардзеец лаяўся чым сьвет стаіць. Высунуўшыся з таксі, ён праводзіў нас адборнымі чатырнаверховымі «прывітаньнямі».

Ужо ад'яжджаючы, мы пачулі:

— Я падпалкоўнік Сяргухоўскага палка, а вы — свалата. Цураецеся?.. Вешаць вас мала!..

А ўсё такі параду «падпалкоўніка» мы выкарысталі: пачалі з савецкага консульства. Спаткалі нас там шчыра, з радасьцю, як пажаданых гасьцей. І адразу-ж параілі:

— У вас мала часу, дык адкіньце-ж прэч турысцкі шаблён. Адмоўцеся ад эўрапейскай часткі Канстантынопалю. Паедзьце ў Азію, там вы зможаце нагледаць характэрныя рыскі старой, адыходзячай у мінулае Турцыі. Тое, з чым вядзе ўпартую вайну Кэмаль-Паша.

І мы апынуліся ў Азіі, мы правялі цэлы дзень у вузкіх, крывых, сьмярдзючых вулічках, дзе ня толькі не разьвернуцца два чалавекі. Сонны спакой, нейкая журботная апатыя непадзельна пануе тут. Жахлівым, застарэлым, затхлым жабрацтвам нясе ад домікаў, якія пакрывіліся. Моладзі ня відаць. Старыя каля чорных з асеўшай зямлёй расчыненых дзьвярэй, старыя ў пракопчаных кафэйнях. Усюды — старыя дзяды.

Кэмаль - Паша зьняў з турчанкі чадру, але на працягу дня мы не спаткалі жанчыны з адкрытым тварам. Наўздагон з эўрапэізацыяй Кэмаль-Паша забараніў насіць фэскі. Забарона, як відаць, засталася на паперы. Фэскамі хоць гаць масьці!..

Шалёным супраціўленьнем сустракаюць кожную, нават часта паказную рэформу Кэмаля духавенства, султанскае чыноўніцтва, зямляўласьнікі і фэадалы. Яны абзываюць дыктатара Турцыі бальшавіком, хоць менш за ўсё Кэмаль вінаваты ў бальшавізьме... Кэмаль жорстка распраўляецца з сапраўднымі бальшавікамі. Правадыры турэцкай кампартыі, рэвалюцыянэры, паўстаўшыя супроць сацыяльнай несправядлівасьці, перапаўняюць анаталійскія турмы. Рэспубліканская паліцыя ня горш за султанскую ведае, як абыходзіцца з «крамольнікамі»...

Кэмаль — правадыр маладой турэцкай прамысловай буржуазіі. Жалезнаю рукою ён скідае з Турцыі цуты сярэдневечча, каб даць ёй магчымасьць увайсьці, як роўнай, ва ўлоньне сучасных капіталістычных дзяржаў. Ён бязьлітасны да тых, хто чапляецца за абломкі мінулага. Ён ня спыняецца перад крайнімі мерамі аж да пераносу сталіцы з старога Стамбулу ў глухую Ангору. І вось панава будуецца новая сталіца. Канстантынопаль гадамі быў пад байкотам. Толькі зусім нядаўна Кэмаль наладзіў урачысты ўезд у яго, як у заваяваны горад, які скарыўся.

Старая Турцыя (у Канстантынопалі адных мулаў 21.000) дажывае ў Канстантынопалі свой век. Усе гэтыя «асколкі разьбітага ўпчэнт» ненавідзяць рэформы. Шляхі шматлікіх змоў супроць Кэмаля, выкрытых у апошні час, вядуць сюды. Адчуваючы сваю пагібель, яны садзяць сваё джала з-за вугла.

..Зьвілістымі завулкамі мы выходзім на нейкі пляц. Наўкола ні душы. Уражаньне такое, быццам гарачае сонца выпаліла ўпчэнт, зьлізала ўсё жывое. Дамы глядзяць сьлепымі сьценамі: старажытная будоўля абарачала вокны ў двор, каб вока чужога чалавека не апаганьвала жыцьля прававерных.

Сярод пляцу пабудова накшталт нашых афішных слупоў. Жаўцее вялікая, нядаўна наклеяная абвестка. На турэцкай і французкай мовах, тлустымі літарамі надрукавана:

«18-га кастрычніка 1929 г. вайсковы суд рэспублікі разглядаў справу б. афіцэраў султанскай гвардыі Ніазім-Пашы і Асіян-Бэя. Даведзена, што яны апаганілі, зьняславілі мундзір і прадалі бацькаўшчыну. Даведзена, што яны імкнуліся зьнішчыць рэспубліку. Даведзена, што яны выступалі супроць Газі. Суд прыгаварыў іх да сьмерці. Здраднікі забіты. Няхай будзе іх ганебная доля перасьцярогаю для іншых ім падобных».

У адмысловых, паўсходняму напышлівых словах — адлюстраваньне барацьбы, якую даводзіцца весьці Кэмалю. На вуліцах старога Канстантынопалю гэты пануры плякат набывае асаблівы сэнс...

* * *

Мы адпльвалі ўвечары. У глыбокай цемры прабіраліся вузкім горлам Дарданэл. Зорнае неба ціснула незразумелым цяжарам. Духата не дазваляла заснуць. Мімаволі вочы цягнуліся да нясных абрысаў берагоў. Вось нямыя сьведкі нядаўніх боек. Тут кожная лапінка зямлі сакавіта паліта крывёю французскіх, ангельскіх і турэцкіх салдат. Бясконцыя спробы саюзьнікаў прарвацца праз Дарданэлы ў Канстантынопаль каштавалі ім безьліч ахвяр і скончыліся няўдачай. Да гэтага часу параходы старанна абыходзяць вытыркліыя з вады мачты загінуўшых у пратоцы ваенных караблёў...

12 гадзін ішоў «Курск» Дарданэламі, і нам здавалася, што мы ідзем бясконцым магілкамі... І толькі раніцою, правёўшы поглядам бяз густу пастаўлены ангельскім урадам помнік у гонар загінуўшых пры аблозе, мы разьвіталіся з Турцыяй.

Б. БЕЛАГОРСКІ.

Канстантынопаль.

ЧЫСТКА САВЕЦКІХ ЯЧЭЕК КП(б)Б

Сваячасова выпраўляючы недахопы і памылкі, узьнімем чыстку партыі на яшчэ большую палітычную вышыню

Шырэй разгорнем агітацыйна-растлумачальную работу сярод рабочых мас.—Прыцягнем рабочых і работніц да актыўнага ўдзелу ў праверачных сходах

Чыстка яшчэ больш узмацняе баяздольнасьць партыйных арганізацый у барацьбе з правым ухілам і прымірэнцтвам

ШТО ПАКАЗАЛА ЧЫСТКА САВЕЦКІХ ЯЧЭЕК У ГОМЕЛЬШЧЫНЕ

«Полесская Правда» ў сваіх апошніх нумарох падагуліла папярэднія вынікі праверкі і чысткі савецкіх ячэек па Гомельскай арганізацыі КП(б)Б. Па Рэчыцкім і Нова-Беліцкім раёнах чыстка ячэек ужо скончана. Хутка скончыцца праверка па Гарадзкім і Залінейным раёнах. Праверку прайшлі 1.000 членаў і кандыдатаў партыі. Праверана 32 парт'ячэйкі Нова-Беліцкага, Рэчыцкага і інш. раёнаў.

З урокаў чысткі ячэек можна зрабіць пэўныя вывады аб праведзенай падрыхтоўчай рабоце да праверкі і чысткі радоў партыі.

«Полесская Правда», падагульваючы вынікі чысткі па 32 ячэйках, канстатуе, што падрыхтоўчая работа праведзена слаба. Шмат якія бюро савецкіх парт'ячэек не ўсьвядомілі, што чыстка павінна прайсьці пад знакам глыбокай і дасканалай праверкі ўсёй партыйна-палітычнай работы, выявіць, як даная ячэйка змагаецца з правым апартунізмам і прымірэнцтвам, за выразнае правядзеньне лініі партыі, як ячэйка змагалася з бюракратызмам і г. д. На жаль, некаторыя бюро не завастрылі ўвагі партыйцаў на гэтых пытаньнях. І таму ў гэтых ячэйках чыстка праходзіла павярхоўна, не выяўляючы асноўных недахватаў і дасягненьняў у рабоце ячэек. Пытаньні, якія задаваліся таварышом, што праходзілі праверку, часамі таксама насілі агульны павярхоўны характар.

Ацэнка камуністага часамі давалася такая: «Добры прыказчык, добры хлапец» і г. д. У некаторых ячэйках былі выпадкі зьвядзеньня асабістых разрахункаў (ячэйка **райсаюзу, акрфа, ЦРК**). Пры праверцы ячэйкі **сувязі** мела месца кругавая парука з боку асобных партыйцаў. Вытворчыя парткалектывы і ячэйкі не прынялі належнага ўдзелу ў чысткі савецкіх ячэек.

Усё гэта кажа аб тым, што многія ячэйкі не ўсьвядомілі поўнасьцю інструкцыі ЦКК УсеКП(б), **невыстарчальна зразумелі палітычнае значэньне чысткі партыі.**

Чыстка прайшла пры вялізнай актыўнасьці мас, пры шырока разгорнутай самакрытыкі, ня гледзячы на асобы. На праверачных сходах па чысткі ячэек ЦРК, камунальнага аддзелу, акрфа прысутнічала ў сярэднім ад 400 да 500 чал. Па дакладах ячэек выказвалася ад 15 да 25 таварышоў. У асноўным крытыка была здаровай, накіраванай на выяўленьне недахватаў. Але ў радзе ячэек былі выпадкі зьвядзеньня асабістых разрахункаў, былі выступленьні, якія змазвалі патрэбнасьць барацьбы з правым ухілам і абаранялі права-апартуністычныя памылкі даных таварышоў. Пры чыстцы ячэйкі сампрамсаюзу некаторыя партыйцы абаранялі палітычныя права - ўхілісцкія памылкі камуністых — кіраўнікоў сампрамкаапэрацыі. Пры чыстцы ячэйкі ЦРК клясавая варожыя элемэнты — гандляры і нэпманы — імкнуліся дыскрэдытаваць лепшых вытрыманых камуністых. Праверкомы, партыйцы і рабочыя масы давалі рэзкі і аднадушны адпор гэтым элемэнтам, выдаляючы іх з праверачных сходаў.

Удзел рабочых у чысткі быў ўсё-ж невыстарчальны. Трэба разгарнуць шырокую агітацыйна - растлумачальную работу па фабрыках і заводах, каб прыцягнуць да ўдзелу ў чысткі савецкіх ячэек як мага больш рабочых і работніц ад варштату.

Насьценныя газэты нездавальняюча асьвятлялі пытаньне праверкі і чысткі ячэек. «Полесская Правда» падае рад фактаў, калі асобныя газэты зусім не зьвярнулі ўвагі на пытаньні чысткі партыі. Напрыклад, насьценгазэта вучпрафсожу Заходніх чыг. не зьмясьціла ніводнай заметкі аб чысткі партыі.

Праверачныя камісіі з укладзенымі на іх палітычнымі задачамі **спраўляюцца.** Работа праверкомаў праходзіць у поўнай адпаведнасьці з інструкцыяй ЦКК УсеКП(б). Але ў асобных выпадках былі дапушчаны некаторыя памылкі, у сувязі з чым прэзыдыум Гомельскай АКК скасаваў пастановы некаторых праверкомаў. У ячэйцы сампрамсаюзу праверачная камісія, канстатуючы праявы ўхілу на практыцы, ня ўжыла арганізацыйных мер супроць тых, хто ў сваёй рабоце скажаў лінію партыі. Гэта памылка была выпраўлена і ў выніку перагляду тры члены гэтай ячэйкі былі выключаны з радоў партыі. АКК скасавала чыстку ячэйкі Палесьсельсаюзу. Там праверком, выкрыўшы рад фактаў скажэньня клясавай лініі і інш. хваравітых зьяў, не пакараў канкрэтных носьбітаў гэтых скажэньняў. У гэтай ячэйцы будзе зроблена паўторная чыстка.

Тэмп перабудаваньня работы ячэек, як паказала чыстка ў адпаведнасьці з тымі палітычнымі задачамі, якія ўскладзены на адміністрацыйна - гаспадарчыя ўстановы, праходзіць марудна. Такая нездольнасьць хутка перабудаваць усю работу ня можа ня прывесьці ў **асобных** выпадках да прытупленьня клясавае чуласьці, да спаўзаньня з бальшавіцкай лініі ў апартуністычнае балота.

Асобныя партыйцы, кіраўнічыя працаўнікі ня толькі на практыцы праводзілі права - апартуністычную лінію, але імкнуліся тэарытычна ўгрунтаваць свае ўхілісцкія памылкі. Так, кіраўнік зямельнага аддзелу Бёдкімаў лічыць, што ў Гомельскай акрузе няма ніякіх пэрспэктыў на разгортваньне калектывізацыі. Зусім ня дзіва, што ў гэтай установе былі дапушчаны правыя скажэньні лініі партыі. Асобныя партыйцы ў замаскаванай форме выступалі супроць тэмпу індустрыялізацыі і г. д.

Праверкомы пры дапамозе радавой партыйнай масы выкрылі сапраўдную сутнасьць гэтых выступленьняў, якія адбівалі інтарэсы нашых клясавых ворагаў.

З праверваных камуністых 107 чал. выключаны з партыі. Чыстка ажывіла работу ячэек, узьняла на нябывалую вышыню актыўнасьць партыйных мас і зрабіла ячэйкі яшчэ больш баяздольнымі, загартаванымі і ідэалёгічна вытрыманымі калектывамі, здольнымі выразна праводзіць лінію партыі.

ВЫПРАВІЦЬ ПАМЫЛКІ НА ХАДУ

На нарадзе бюро савецкіх ячэек КП(б)Б пры Фрунзаўскім райкоме

Праверка і чыстка савецкіх ячэек КП(б)Б — у самым разгары. Зараз ўжо ёсьць магчымасьць зрабіць некаторыя вынікі і выправіць хібы, што наглядаюцца ў ходзе чысткі. Гэтым пытаньнем і занялася нарада бюро савецкіх ячэек разам з рабочымі брыгадамі і праверачнымі камісіямі, якая адбылася гэтымі днямі пры **Фрунзаўскім райкоме КП(б)Б.** Нарада заслухала і дэталька абгаварыла даклад старшыні Мен. АКК КП(б)Б тав. **Дамброўскага.**

Папярэднія вынікі праверкі і чысткі паказваюць, што большасьць савецкіх ячэек КП(б)Б здавальняюча падрыхтавалася да чысткі. Ячэйкі мабілізавалі вакол праверкі партыйных радоў шырокія масы партыйцаў і беспартыйных служачых. Ячэйкі ўсьвядомілі асноўныя задачы чысткі і актыўна дапамагалі праверачным камісіям у іх вялікай і адказнейшай рабоце.

Аднак, ня ўсе ячэйкі ўсьвядомілі задачы чысткі. Некаторыя ячэйкі пальцам аб палец ня стукнулі для падрыхтоўкі да праверкі. Яны абмежаваліся толькі казённымі фармальнымі дакладамі на партыйных сходах, прыняцьцем адпаведных рэзалюцый і... на гэтым паставілі кропку. Аб забесьпячэньні актыўнага ўдзелу масы рабочых і служачых у праверачных сходах, аб мабілізацыі ўвагі партыйцаў і беспартыйных супраціўнікаў нават сваёй установы асобныя ячэйкі не паклапаціліся. У выніку праверачныя сходы гэтых ячэек праходзілі вяла, неактыўна, а некаторыя сходы нават зусім былі сарваны з-за непадрыхтоўкі да чысткі.

Няўважліва аднесьліся да чысткі савецкіх ячэек вытворчыя ячэйкі КП(б)Б. Многія з апошніх фармальна аднесьліся да гэтай важнейшай справы і абмежаваліся толькі вылучэньнем рабочых брыгад, прычым часамі і кандыдатуры ў рабочыя брыгады падбіраліся нядбайна. Некаторыя брыгады правялі абсьледваньне работы ячэек павярхоўна, паказённаму і ня выявілі хворых бакоў работы. У ячэйку Белжылсаюзу былі вылучаны два рабочыя — кандыдаты партыі з 4-х і 7-мімесячным стажам, таварышы мала падрыхтаваныя, не ўсьвядоміўшыя асноўныя задач чысткі. Гэтыя таварышы на праверачным сходзе стварылі склоку, высунуўшы беспадстаўныя абвінавачаньні супроць двух членаў ячэйкі. Пры праверцы-ж фактаў усё аказалася простым паклёпам. Таварышы заявілі, што ячэйка гнілая, што бюро ячэйкі разлажылася і г. д. У сапраўднасьці-ж ячэйка у асноўным здаровая, бюро ячэйкі — таксама. Рабочая брыгада была ўведзена ў зман асобнымі супрацоўнікамі Белжылсаюзу.

У асноўным-жа рабочыя брыгады шмат чым дапамаглі праверцы савецкіх ячэек.

Самакрытыка ў большасьці савецкіх ячэек разгорнута слаба. Праверачным камісіям прыходзілася прымаць меры для разгортваньня самакрытыкі на хаду чысткі. У **некаторых** ячэйках панавала кругавая парука з боку партыйцаў і боязьнь крытыкаваць з боку беспартыйных. Вось характэрны факт. У ячэйцы ЦВК БССР адзін таварыш прайшоў чыстку пры воцлесках. На справе-ж гэты таварыш зрабіў рад антыпартыйных учынкаў, але яны былі ўтоены ад праверкому.

Чужыя партыі элемэнты, тыя, каму праверка і чыстка пагражае арганізацыйнымі вынікамі, імкнуцца перашкодзіць нармальнаму ходу праверкі. Былі спробы ператварыць праверачныя сходы ў месца для зьвядзеньня асабістых разрахункаў. Былі выпадкі неўгрунтаваных выступленьняў супроць асобных камуністых, бальшавіцка - вытрыманых таварышоў, з мэтай скампрамэтаваць іх перад праверкомам. Былі таксама спробы дыскрэдытаваць праверачныя камісіі. У ячэйцы Наркамзему член партыі Лагучык высунуў супроць старшыні праверкому т. Бягуна цэлы рад абвінавачваньняў аж да крымінальных злачынстваў. Пры праверцы ўсе абвінавачаньні аказаліся брыдкім паклёпам. У ячэйцы Белжылсаюзу два члены партыі Ганцэвіч і Давідаў абвінавацілі старшыню праверкому тав. Юдэльсона і члена праверкому тав. Захараву ў аднабокім, тэндэнцыйным падыходзе пры чыстцы асобных камуністых. Фактычна-ж праверком правільна, пабальшавіцку праводзіў праверку ячэйкі, садзейнічаў разгортваньню самакрытыкі, не дапушчаючы зьвядзеньня асабістых разрахункаў на праверачных сходах. Ганцэвіч і Давідаў атрымалі рашучы адпор з боку ўсёй ячэйкі за паклёпніцкую вылазку супроць праверкому.

Ёсьць асобныя хібы ў рабоце праверкому. Некаторыя праверачныя камісіі не заўсёды дасканала правяралі факты, што прыводзіліся на сходах і прымалі іх, як аснову, для вынікаў праверкі. Ячэйкі не крытыкуюць работы праверкому. Ёсьць выпадкі, калі бюро ячэйкі хадайнічае аб аднаўленьні асобных таварышоў, выключаных з партыі у часе чысткі. Дзе-ж былі бюро ячэйкі раней, чаму яны не крытыкавалі работы праверкому?

У спрэчках па дакладу тав. Дамброўскага выказалася каля 20 чалавек. Нарада вынесла рэзалюцыю, у якой адзначыла ўсе недахопы ў ходзе праверкі і чысткі і намеціла рад канкрэтных мерапрыемстваў для зьнішчэньня іх.

С. Г—н.

На словах і на справе

Гэтымі днямі скончылася праверка ячэйкі КП(б)Б чыгуначнага тэхнікуму. Праверком у сваіх вывадах адзначыў цэлы рад сур'ёзных дэфэктаў у рабоце ячэйкі. Ячэйка ў асноўным ідэалёгічна здаровая, але асобныя члены партыі хістаюцца пры вырашэньні палітычных пытаньняў, у радзе выпадкаў, праводзячы на практыцы права-апартуністычную лінію. Партыйцы **Круглікаў і Глушакоў** дапусьцілі ў сваёй рабоце права - ўхілісцкія памылкі, аднак, гэтых памылак яны і даготуль шчыра ня прызналі. Члены ячэйкі **Саўчук і Абушэнка** ад ідэалёгічных апартуністычных хістаньняў перайшлі да правядзеньня права ўхілісцкай лініі на практыцы. На словах «камуністы» **Абушэнка** актыўна змагаўся з правым ухілам і прымірэнцтвам і ўхваляў рэзалюцыю супроць права апартунізму. Аднак, на справе ён у сваёй вёсцы, як член партыі не агітаваў за калектывізацыю, не праводзячы лініі партыі. У сапраўднасьці Абушэнка быў проста кулачком, які імкнуўся як мага хутчэй узьняць сваю індывідуальную гаспадарку, эксплёатуючы пры гэтым наёмных батракоў.

Чыстка паказала слабую палітычную пісьменнасьць членаў ячэйкі. Праверком прапанаваў ячэйцы максымальна разгарнуць палітычную вучобу, мабілізуючы членаў ячэйкі на барацьбу з канкрэтнымі праявамі права ўхілу. З партыі выключаны тры чалавекі. **Р.-к.**

НА АКРУГУ

Сваячасова падрыхтуемся да перавыбараў саветаў

Не дапусьцім кулакоў у савецкі апарат

На вячэрнім пасяджэньні 16-га лістапада сакратар Мен. АВК т. **Паромчык** выступіў з дакладам аб задачах падыходзячай справаздачна - перавыбарчай кампаніі саветаў і камітэтаў сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі.

— Кулацкія элемэнты імкнуцца пралезьці ў нашы саветы, камітэты ўзаемадапамогі, каб у гэтых савецкіх і грамадзкіх установах праводзіць сваю клясавую, чужую нам лінію і падрываць нашу работу. Адсюль выпадкі скажэньня клясавай лініі ў нашых сельсаветах і камітэтах узаемадапамогі.

— Улічваючы гэта,—адзначае т. Паромчык,—трэба добра падрыхтавацца да надыходзячай справаздачна-перавыбарчай кампаніі, да перавыбарчых сходаў сельсаветаў і камітэтаў узаемадападапамогі. Наўкола гэтых сур'ёзнейшых кампаній трэба зараз-жа мабілізаваць грамадзкую думку батрацтва, беднякоў і серадняковай, адначасова ізаляваўшы кулацкую частку вёскі.

Дакладчык прыводзіць рад фактаў арганізаванага выступленьня кулакоў у часе мінулых перавыбараў саветаў. Кулакі ні перад чым ня спыняліся, каб правесьці сваіх кандыдатаў у саветы. Арганізоўвалі падпольныя сходы кулакоў і падкулачнікаў, падкупялі беднату, зрывалі сходы бедноты і г. д. Аднак, ня гледзячы на ўсе манэўры і перашкоды клясавага ворага, з кожным годам павялічваецца ўдзел бядняцка-серадняцкіх мас у перавыбарах саветаў, расьце клясавая сьвядомасьць.

Агульная яўка на перавыбары ў мінулую кампанію склала 62,25 проц., або на 16,85 проц. больш, чым у перавыбарную кампанію 1926-27 г. Калі ўзяць яўку на перавыбары па асобных групах, дык удзел будзе наступны: с.-г. рабочых—76,5 проц., беднаты—64,11 проц. Значна павялічыўся таксама ўдзел жанчын у мінулай перавыбарчай кампаніі, які дасягнуў 45 проц.

У мінулую перавыбарчую кампанію наглядаўся рад недахопаў, як невыстарчальная колькасьць выбарчых вучасткаў, адсутнасьць належнай пралетарскай праслойкі ў выбарчых камісіях. Ня было належнага адпору кулацкіх элемэнтам.

Якія задачы стаяць зараз у перавыбарчай кампаніі перад групамі беднаты?

Групы беднаты павінны наперад абгаварыць кандыдатуры ў выбарчыя камісіі, каб туды трапілі клясава-сьвядомыя людзі. Да складаньня сьпісаў пазбаўленых выбарчых праў трэба падыходзіць вельмі ўважліва. Трэба сачыць, каб у сьпісах ня быў прапушчаны кулак, або нэпман і каб ня былі пазбаўлены выбарчых праў сяляне-беднякі і сераднякі.

Усе арганізацыі на вёсцы павінны сваячасова падрыхтавацца да справаздачна-перавыбарчай кампаніі. Прафэсыянальныя арганізацыі павінны накіраваць у вёску рад работнікаў для дапамогі ў перавыбарах. Адначасова трэба праверыць, як выканалі саветы наказы выбаршчыкаў, як справіліся камітэты ўзаемадапамогі з разьмеркаваньнем ільгот беднаце, каапэраваньнем беднаты і ўдзяганьнем беднаты ў калгасы.

Даклад т. Паромчыка выклікаў гарачыя спрэчкі, якія заняллі канец вячэрняга і ранішняе пасяджэньня.

— Часта члены сельсавету—кажа тав. **Каваленка,**—ня толькі ня бываюць пачынальнікамі розных кампаній, але наадварот, праваль ваюць іх. Агрэмінімум не заўсёды праводзіцца ў жыцьцё членамі сельсаветаў.

Селянін **Адамовіч** зазначае, на прыкладзе, як культурная работа ў тых сельсатах, куды пралезьлі кулакі. Так, у Строчынскім сельсавеце, Самахвалавіцкага раёну, старшыня савету мае 15 дзес. зямлі і зьяўляецца заможным селянінам. Дзякуючы такому старшыні, маса кулакоў у гэтым сельсавеце ня выяўлена.

У Клінацкім сельсавеце,—апавядае **тав. Асіпчык,** старшыня адмаўляўся загатаўляць насельне для сяўбы. У Калодзішчанскім сельсавеце вызвалены ад падатку заможныя сяляне.

Аб засьмечанасьці камітэтаў узаемадапамогі гаварылі і другія таварышы. Так, у Клінацкім сельсавеце ў камітэце ўзаемадапамогі працаваў поп. У Заслаўскім камітэце ўзаемадапамогі ішло каапэраваньне кулакоў за кошт фондаў беднаты.

Выступаўшыя беднякі і бядняцкі адзначалі па патрэбнасьць большага ўцягненьня жанчын у работу сельсаветаў і камітэтаў узаемадапамогі.

Тав. **Вол, Гарашчэня, Вілюга** і інш. адзначалі, што жанчыны, якія ў мінулую кампанію былі выбраны ў члены сельсаветаў, ня толькі апраўдалі сябе, але і працавалі ў некаторых мясцох значна лепш і ўважлівей, чым мужчыны.

КП(б)Б дае руйнуючы адпор правым капітулянтам

Патрабуем поўнага падпарадкаваньня бальшавіцкай дысцыпліне

Спыніць фракцыйную дзейнасьць правых банкрутаў

Парткалектыў заводу **«Энэргія»,** заслухаўшы даклад т. Кугеля аб унутрыпартыйным становішчы і апошніх фракцыйных вылазках правых апартуністых, канстатуе, што:

— Ня гледзячы на дасягненьні сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне, на магутны рост калектывізацыі сельскай гаспадаркі і шпаркі тэмп індустрыялізацыі, што лішні раз давозіць правільнасьць генэральнай лініі партыі,—правыя капітулянты ня спыняюць сваёй фракцыйнай барацьбы супроць партыі і Камінтэрну.

Правыя апартуністыя працягваюць настойваць на сваіх апартуністычных антыпартыйных поглядах, не прызнаючы памылковасьці сваёй капітулянцкай пазыцыі, і ня спыняючы сваіх паклёпніцкіх нападкаў на партыю.

Пленум патрабуе ад групы т. Бухарына поўнага прызнаньня сваіх правых ухілісцкіх памылак.

Пленум патрабуе ад пленуму ЦК УсеКП(б) ужыць рашучыя і энэргічныя меры ў адносінах да правых фракцыянэраў, якія, ня гледзячы на ўсе перасьцярогі, вядуць і далей фракцыйную барацьбу супроць бальшавіцкай партыі і Камуністычнага Інтэрнацыяналу.

Пленум цалкам і поўнасьцю далучаецца да рэзалюцыі Менскага партактыву па гэтым пытаньні. Пленум заклікае арганізацыю да яшчэ больш рашучай, да яшчэ больш бязьлітаснай барацьбы з правым апартунізмам і прымірэнцтвам, не паслабляючы адначасова барацьбы з «левымі» наскокамі на лініі партыі.

Патрэбны арганізацыйныя меры

Пашыраны пленум Кастрычніцкага РК КП(б)Б, заслухаўшы інфармацыю аб унутры-партыйным становішчы і апошніх фракцыйных вылазках правых апартуністых, канстатуе, што:

— Ня гледзячы на дасягненьні сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне, на магутны рост калектывізацыі сельскай гаспадаркі і шпаркі тэмп індустрыялізацыі, што лішні раз давозіць правільнасьць генэральнай лініі партыі,—правыя капітулянты ня спыняюць сваёй фракцыйнай барацьбы супроць партыі і Камінтэрну.

Правыя апартуністыя працягваюць настойваць на сваіх апартуністычных антыпартыйных поглядах, не прызнаючы памылковасьці сваёй капітулянцкай пазыцыі, і ня спыняючы сваіх паклёпніцкіх нападкаў на партыю.

Пленум патрабуе ад групы т. Бухарына поўнага прызнаньня сваіх правых ухілісцкіх памылак.

Пленум патрабуе ад пленуму ЦК УсеКП(б) ужыць рашучыя і энэргічныя меры ў адносінах да правых фракцыянэраў, якія, ня гледзячы на ўсе перасьцярогі, вядуць і далей фракцыйную барацьбу супроць бальшавіцкай партыі і Камуністычнага Інтэрнацыяналу.

Пленум цалкам і поўнасьцю далучаецца да рэзалюцыі Менскага партактыву па гэтым пытаньні. Пленум заклікае арганізацыю да яшчэ больш рашучай, да яшчэ больш бязьлітаснай барацьбы з правым апартунізмам і прымірэнцтвам, не паслабляючы адначасова барацьбы з «левымі» наскокамі на лініі партыі.

Язэп Вазёрны

У абнімках ворага

Восень.
Пажоўклы таполь,
Лісьцем укрыты дарогі.
.. Жоўтая
Лётае моль
Шкодзіць у час перамогі.
А сэрца стучыць
У такт,
Сэрца складае песьню:
— Будуем вялікі тракт
Да новых,
Да сонечных весьніц!
Учора
Збудован завод,
Сёньня капгас вырастае,
Баяцца
Ня трэ' перашкод
Нам, загартованым сталлю.
Нашы
Мацнеюць рады
Працоўнае клясы атрады.
А ёсьць і такія:
Крычаць—хутары!
Яны і калгасам ня рады
Іх заклік:
«Паменшыце тэмп!»
Іх пёзунг:
«Праверце разьлік!»
.. Ня вераць,
Што мы і стэп
Абернем у калгас вялікі.
Плян пяцігодкі!
(ў іх сэрцы туга)
Вялікага плян будаваньня!
І плача надрыўна
Ныцік і трус—
Спалохаўшыся змаганьня.

* * *

І вораг ня сьпіць.
Цяпер ён ходзіць
Пад розным абліччам...
Як нейкі дзівосны зьвер,
Капае ўсюды пычам...
А песьня змаганьня
Нашае радасьці песьня:
— Будуем вялікі тракт,
Да новых,
Да сонечных весьніц!

ЗЬБІРАЛАСЯ ВАРАНЬНЕ

Вароны пляцелі
Чарнейшыя хмар,
З жаданьнем нам сонца засьціць.
Шапёнствам яны
Працінаці абшар,
Бачачы наскае шчасьце.
Каркаюць чорныя!
Як-жа!)
«Гэткіх вынікаў мы не чакалі...
Нам пэпэсаўцы кажуць,
Што Беларусь закапалі.
«Ей-жа краіне наскай
З панам хацелася быць(?),
Мець сваю ўласную частку...
І «незалежнасьць» набыць...
Езьдзіць на сойм
у Варшаву,
Ўпасны маёнтак мець,
— Я—беларускі
Маршалак!! »
(Як гэта будзе зьвінець!)
«О! Вы прыгожыя мары!
О! Вы прыгожыя сны!
Пан нас зямлёю надарыць»
Будзем мы
Польшчы сыны!
Мы за народ—
Дэмакраты!
Мы заклапочаны ім...
— Кракае груган над хатай—
Дапамагае другі.
Каркаюць чорныя:
Восень...
Згублены шараць абшар...
Бачыце—гэта здалося
Ім сярод беленькіх хмар.
Посьпехі:
Засьцяць ім дзень
Агентам варожага стану...
Каркаюць, яны ў аванпосьце
Яднаваньмножнага пана
Досыць нам казак
Нішчымных!
Чуля ўжо іх Беларусь
Чула, як пан над плячыма
З пугай—пакручываў вуе.
Цяжка жылося краіне,
Гэта ня помніце (думаю)
Досыць нам кракаць
З асіны
У час, калі шчасьце
Будуем.

І

Ёсьць квартэт у мяне—
Мастадонтаў,
(Ад іх выгляду робіцца прыкра,
У грамадзтва бываюць падонкі
І квартэт, як яскравы
Прыклад.
Слова першае

Загатоўкі ільну праходзяць слаба

Пляны загатовак не даведзены да вёскі

Выканаць у тэрмін дадатковыя заданьні па хлебазагатоўках. — Арганізаваць рабочыя брыгады для кантролю за складамі хлеба

Месячны плян загатовак ільну выкананы толькі на 20 проц.

Ільна-валакно дагэтуль паступае вельмі слаба. На 15 лістапада, паводле тэлеграфных вестак Наркамгандлю, месячны плян загатовак ільну выкананы ўсяго на 20%. Па асобных округах выкананьне пляну ідзе наступным чынам: Бабруйскага округа выканала ўсяго 9,1 проц. месячнага пляну, Віцебская—35,3 проц., Аршанская—22,8 проц., Магілеўская—17 проц. Адстаюць зусім Гомельская округа, якая выканала ўсяго 7,2 проц., Мазырская—10 проц., Полацкая—7 проц. і Менская—4,2 проц.

Зусім адсутнічае ўсякая інфармацыя з боку загатоўшчыкаў і акргандляў аб тым, як ажыцьцяўляецца дырэктыва Ураду аб давядзеньні пляну да сяла. Паводле вестак, пляны амаль што нідзе яшчэ не даведзены да вёскі, што значна затрудніе загатоўкі ільну.

Наляводсаюз не зьвярнуў належнай увагі на справу спагнаньня закантрактаванага ільну. Да гэтага часу Папяводсаюз ня мае вестак аб тым, як ідзе здача закантрактаванага ільну. Гэта ў той час, як у лістападзе павінна быць спагнана 25 проц. закантрактаванага ільну па дагаворах. Зусім ня выконваюцца дырэктывы аб наладжаньні датэрміновай здачы закантрактаванага ільну.

Белкаапсаюз усё яшчэ не паставіў належным чынам падлік забесьпячэньня ільнаводных раёнаў прамтаварамі і скарыстаньня іх па мэтавым прызначэньні.

Ёсьць небясьпека, што тавары, якія накіраваны ў ільнаводныя раёны, скарыстоўваюцца ня толькі для мэтаў прэміяваньня здатчыкаў ільну. Такія зьявішчы ўжо мелі месца ў Гомельскай, Полацкай і Віцебскай округах, дзе накаторыя тавары, што былі накіраваны выключна для ільна-здатчыкаў, перадаваліся ў другія фонды.

Пільны кантроль за хаваньнем хлеба

Рабочыя брыгады—для нагляду за хлебнымі складамі

Хуткі тэмп хлебазагатовак даў магчымасьць у вельмі кароткі тэрмін сканцэнтраваць у руках дзяржавы вялізныя масы хлеба. Калі за хаваньнем хлеба ня будзе ўстаноўлены пільны кантроль, могуць здарыцца выпадкі псаваньня асобных партый хлеба.

Непасрэдная адказнасьць за цэласьць хлебных запасаў падае на хлебазагатоўчыя арганізацыі. Апошнія павінны стварыць умовы, якія гарантуюць поўную захаванасьць мільённых хлебных запасаў.

Кантроль за становішчам хлебных запасаў зьяўляецца аднэй з важнейшых задач дзяржаўнай хлебнай інспэкцыі, Саюзхлеба і каапэрацыйных арганізацый. Аднак, гэтыя арганізацыі могуць з посьпехам праводзіць сваю работу толькі ў тым выпадку, калі ўвага ўсёй савецкай грамадзкасьці будзе мабілізавана вакол пытаньня хаваньня абожжа.

Фабрычна - заводзкія і грамадзкія арганізацыі павінны вылучыць спэцыяльныя брыгады, якія будуць прымацаваны да хлебных складаў і кантраляваць хаваньне хлеба. Вялікую дапамогу могуць тут зрабіць атрады лёгкай кавалерыі.

Кулакі ў сваім супраціўленьні сацыялістычнаму наступленьню ня спыняцца перад падпалам будынкаў з хлебам. Ад вясковай грамадзкасьці патрабуецца выключная пільнасьць, каб папярэдзіць усякую пагрозу хлебным запасам.

Самацёкам...

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Кампанія загатовак ільну па акрузе ідзе зусім спаба. Мясцовыя арганізацыі і савецкая грамадзкасьць мала ўвагі зварачаюць на гэту кампанію. Загатоўкі ідуць самацёкам — дагэтуль выканана толькі 6% гадавога заданьня.

Пляны загатовак ільну не даведзены да вёскі.

Патрэбны рашучы пералом у загатоўках ільну!

Скончыць хлебазагатоўкі да 20-га лістапада

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Да 10-га лістапада заданьне па хлебазагатоўках выканана на 92 проц. Недавыкананьне загатовак тлумачыцца тым, што ў радзе раёнаў слаба паступае збожжа па кантрактацыі. Да такіх раёнаў трэба аднесьці Люсаньскі, Глускі і Чырвона-Слабодзкі.

Новае заданьне на хлебазагатоўках павялічыла округовы плян на 26,7 проц. Зараз-жа, пасьля атрыманьня гэтага заданьня, на месцы камандыравана 35 працаўнікоў з акруговага цэнтру.

Прэзыдыум АВК прапанаваў мясцом выканаць новае заданьне выключна за лік кулацка-заможных гаспадарак. Райвыканкомам прапанавана праверыць, як выконваюцца кулацка-заможнымі гаспадаркамі ранейшыя заданьні па загатоўках, як выконваюцца пастановы агульных сходаў.

АВК паставіў перад усімі арганізацыямі задачу — скончыць хлебазагатоўкі да 20-га лістапада.

Транспарт не пасьпявае за хлебазагатоўкамі

«Налёт» рабочай брыгады на чыгуначны вузел.

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Рабочая брыгада з 20 чал. зрабіла налёт на Гомельскі вузел чыгункі. Брыгада павінна была праверыць, як выконвае транспарт заданьні па хлебаперавозках.

Брыгада знайшла, што дырэктывы ўрадовай камісіі аб максымальнай разгрузцы вузла, аб зьніщэньні пробак і затораў ня выконваюцца.

На галоўным складзе знойдзена 5 вагонаў, якія былі разгружаны раніцой і стаялі да позьняга вечара. Адзін вагон быў нагружаны з лістапада, а адпраўлены толькі 5-га. Былі выпадкі, калі 4 вагоны, паданыя пад хлеб, прастаялі двое сутак з-за адсутнасьці рабочай сілы.

З 1-га па 6-га лістапада патрэбна было 235 вагонаў пад хлеб, далі — 207 вагонаў. Высылаюцца брудныя, непрамытыя вагоны.

Адным з асноўных тормазаў хлебазагатовак зьяўляецца бясплянавасьць пагрузкі хлебных грузаў.

Значна пагоршыўся рух цягнікоў, пагоршылася і карыстаньне вагоннага парку.

Чыгуначная адміністрацыя вельмі слаба кіруе ўдарнай работай транспарту; няма ніякага кантролю з боку прафэсыянальных арганізацый.

Гомельскі вучпрафсож пастанавіў правесьці вытворчыя нарады з дакладамі членаў брыгады, акрамя таго, арганізаваць нараду гаспадарчых органаў разам з прафэсыянальнымі арганізацыямі для мабілізацыі ўвагі мас чыгуначнікаў вакол хлебаперавозак.

П. П.

Тыраж 1-ай пазыкі індустрыялізацыі ў Віцебску

20-га лістапада гэтага году ў гор. Віцебску адбудзецца 9-ты тыраж выйгрышаў па 1-й пазыцы індустрыялізацыі. Гэты тыраж, таксама як і ўсе ранейшыя тыражы выйгрышаў, павінен зьявіцца адным з галоўных момантаў па папулярызацыі дзяржпазык сярод працоўнага насельніцтва.

Да гэтага часу дзяржава яя выплаціла трымальнікам пазык каля 40 мільёнаў рублёў па выйгрышах, па ранейшых тыражох і купонах ад аблігацый. У Наркамфін зьяўляюцца пасобныя трымальнікі пазык з просьбаю зрабіць так, «каб на іх аблігацыі прыпалі выйгрышы». Усе гэтыя прыклады сьведчаць аб тым, што значная частка трымальнікаў пазык яшчэ да гэтага часу цьмяна ўяўляе саба справу дзяржпазык і іх значэньне.

Некаторыя трымальнікі пазык здаюць, не праверыўшы свае аблігацыі, у выплату сельска-гаспадарчага падатку. Між тым, пры праверцы аблігацый па выйгрышных табліцах аказвалася, што выйгрыш прыпаў на гэту аблігацыю аж 2 гады таму назад.

Усе гэтыя факты гавораць нам аб тым, што арганізацыі па праводзяць патрэбнай растлумачальнай працы аб пазыках і слаба займаюцца папулярызацыяй іх. Нездавальняюча пастаўлена гэта работа ў крэдытных установах, у ашчадных касах і іншых установах, у абавязак якіх уваходзіць штодзённае сыстематычнае абслугоўваньне трымальнікаў пазык рознымі інфармацыйнымі даведкамі.

Тыраж, які адбудзецца на тэрыторыі БССР у гор. Віцебску, павінен зрабіць пералом у рабоце нашай грамадзкасьці па дзяржпазыках. Работа, якая будзе праведзена вакол тыражу, павінна ператварыцца ў тыровую палітычную масавую кампанію па папулярызацыі дзяржпазык і наогул дзяржкрэдытаў сярод шырокіх працоўных мас гораду і вёскі.

Рабцэвіч.

Да перазаключэньня калектыўных дагавароў

НІВОДНАГА ДНЯ АДЦЯЖКІ

Кампанія павінна быць скончана сваячасова

Спазьніліся з калдага вориайкампаніяй

Для абгаварэньня праверкі і перазаключэньня калдагавароў быў скліканы актыў саюзу саўгандальслужачых, але ніхто на сход не зьявіўся. Тады 14-га лістапада гандлёвая сэкцыя саюзу склікала ўсіх старшынь і сакратароў мясцкомаў для абгаварэньня правядзеньня калдагаворнай кампаніі.

Ва ўступным дакладзе тав. Рабінін абмінуў цэлы рад важнейшых момантаў. Вельмі слаба закрануў палітычнае значэньне калдагавароў і інш. І гэта ня дзіва. ЦП саюзу яшчэ ня здолела перайсьці на новыя рэйкі работы і пытаньне аб калдагаварох дэтальна ня было прапрацавана.

Актыў, які прысутнічаў, гледзячы на сваё «начальства», таксама не падышоў правільна да гэтага пытаньня. Аб гэтым сьведчыць цэлы рад выступленьняў старшынь мясцкомаў, якія абмяркоўвалі калдагавары выключна з пункту погляду зарплаты. Яны падкрэсьлівалі цэлы рад драбніц, гаварылі аб дробных тэхнічных пытаньнях, якія ні ў якім разе не павінны і ня могуць быць вырашаны на такім сходзе, а павінны прапрацоўвацца і вырашацца выключна на сходах установаў, бо нельга параўнаць умовы работы МЦРК з Белмясгандлем, ці ВСНГВ з працкалектывамі і г. д. Ніхто з прамоўцаў, за выключэньнем аднаго ці двух, не закрануў пытаньня пяцігодкі, якая павінна заняць галоўнае месца ў перазаключэньні калдагавароў, ніхто не гаварыў аб абавязках, якія павінны быць прад'яўлены да супрацоўнікаў, аб тым, што калдагавор — гэта палітычны дакумант, двухбаковы абавязак.

— Мы спазьніліся, гэта праўда, — заявіў у заключным слове тав. Рабінін, —але ў гэтым вінаваты УсеЦСПС, які ў першым дырэктыўным лісьце паказаў больш позьнія тэрміны...

У калектывах яшчэ зусім не гаварылі аб калдагаварох, насьценныя газэты ніводнай заметкі не прысьвяцілі гэтай важнай палітычнай кампаніі.

А, між тым, часу засталося мала, бо да 1-га студзеня кампанія павінна быць закончана.

Калектывам трэба безадкладна ўзяцца за справу і разгарнуць самую шырокую і інтэнсыўную калдагаворную кампанію, ставячы ў аснову абмеркаваньня дагавароў нашу пяцігодку. Калдагавары павінны быць заключаны, як двухбаковыя абавязацельствы.

АЛЕСЬ ПЧОЛКІН.

Толькі цяпер брыгады прыступілі да працы

На некаторых менскіх заводах праверка калдагавароў знаходзіцца яшчэ ў стадыі разгортваньня. Рабочыя на сваіх цэхавых сходах вылучаюць спэцыяльныя брыгады для праверкі выкананьня калектыўных дагавароў.

Так, на заводзе «Дрэваапрацоўшчык» рабочыя на цэхавых сходах вылучылі некалькі груп для праверкі дагавароў і для правядзеньня падрыхтоўкі да заключэньня новага дагавору. Вылучаныя групы прыступілі ўжо да работы.

Швэйная фабрыка «Кастрычнік» вылучыла 4 брыгады рабочых, па 7-9 чалавек у кожнай. Праз некалькі дзён на пасяджэньні фабкому, а пасьля на агульным сходзе рабочых яны даложаць аб выніках праверкі.

ЦЫВЕС.

Рабочыя „Пралетара" ганьбяць паклёпніка

Як паведамляе «Полесская Правда», у часе абмеркаваньня новага калдагавору рабочы чыгуна-ліцейнага цэху заводу «Пралетары» Снытко выступіў з паклёпніцкімі выпадамі па адрасе партыі і ўраду: чаго, маў, нас кормяць чарвівым хлебам і сьмярдзючым мясам, чаго нас морыць голадам і г. д. Прамову сваю Снытко перасыпаў адборным «матам».

Лятучыя сходы па цэхах, выкліканыя гэтым выступленьнем, ганьбяць паводзіны Снытко і патрабуюць безадкладнага яго звальненьня з заводу.

Снытко вядомы, як прагульшчык, як самы нядбайны рабочы, бо ў яго самы вялікі процант браку.

Да рэчы кажучы, заработак Снытко даводзі вялікі—200 руб. у месяц (ды дачка Снытко працуе на заводзе і заробле 70 руб. у месяц).

Апрача гэтага, як паведамляе «Полесская Правда», фабрычна-заводзкая газэта «Красная Вагранка» ўзьняла кампанію супроць групы рабочых, што маюць кулацкую гаспадарку, але яшчэ на гэта належным чынам не рэагавалі ні заводзкі партканлектыў, ні асобныя члены партыі.

Адказваем рабочым „Чырвоная Зорка"

Ліст рабочых фабрыкі „Прагрэс".

Мы, рабочыя і служачыя цукернай фабрыкі «Прагрэс», абгаварылі ліст дняпратроўскіх рабочых і рабочых дражджавога заводу «Чырвоная Зорка» і заяўляем, што цалкам і поўнасьцю далучаемся да іх заклiку. Наша цукерная фабрыка яшчэ нядаўна была працкалектывам з 65 рабочымі. Працавалі ў цёмным і сырым сутарэньні. 8 месяцаў таму назад наша фабрыка перайшла да Белдзяржтэсту. За гэты час рабочы калектыў ф-кі павялічыўся да 240 чал. Зараз умовы працы значна палепшыліся, паленшылася і наша матар'яльнае становішча. Калі наша фабрыка была працкалектывам, прадукцыйнасьць кожнага рабочага раўнялася 17,9 кгр. Сярэдняя зарплата ў месяц—43 руб. Зараз прадукцыйнасьць кожнага рабочага 30,5 кгр. Сярэдняя зарплата ў месяц складае—67 руб. 25 к. Праз год мы пераходзім у новае памяшканьне, пабудаванае спэцыяльна для цукернай фабрыкі, што дасьць нам магчымасьць яшчэ больш падняць нашу прадукцыйнасьць.

Усе гэтыя дасягненьні мы маем толькі дзякуючы правільнаму кіраўніцтву Камуністычнай партыі ў сацыялістычным будаўніцтве нашай прамысловасьці. У часе сацспаборніцтва ў нас на фабрыцы арганізавалася 5 ударных брыгад. Дзьве брыгады заключылі між сабою асабістыя дагавары. 160 рабочых фабрыкі добраахвотна падалі заявы на павышэньне норм выпрацоўкі, што дало магчымасьць зьнізіць сабекошт прадукцыі на 3,64% Прагулы зьнішчаны да 0,02% Праграмныя заданьні выканалі з перавышэньнем на 30-40 проц Адміністрацыйна-гаспадарчыя выдаткі зьнижаны на на 20,9 проц.

Калі да сацспаборніцтва процант браку даходзіў да 10 проц., то зараз брак складае толькі 1,01 проц. У парадку сацспаборніцтва мы на 3-ю пазыку індустрыялізацыі падпісаліся на 101 проц. свайго заработку. Мы пачалі ўжо далатакова падпісвацца на 3-ю пазыку індустрыялізацыі.

Усе гэтыя дасягненьні, мы лічым, што ня толькі ўтрымаем, але і пойдзем наперад.

Заключаючы новы сацдагавор з Гомельскай цукернай фабрыкай, мы абавязваемся ў другім годзе пяцігодкі зьнізіць сабекошт прадукцыі на 12 проц., падняць прадукцыйнасьць працы на 30 проц. Мы таксама абавязваемся ліквідаваць няпісьменнасьць на 100 проц. Мы ведаем, што калектыўны дагавор ёсьць двухбаковае абавязацельства для выкананьня. Мы будзем упарта і рашуча весьці барацьбу з усялякімі рвацкімі настроямі і з тымі, якія папрабуюць зрываць правядзеньне ў жыцьцё другога году пяцігодкі. Усе гэтыя дасягненьні якія мы маем, і тыя абавязацельствы, якія мы ўзялі на сябе, сьведчаць аб тым, што шлях партыі правільны і што панікёры з права-апартуністычнага лягеру поўнасьцю збанкрутаваліся.

Мы, рабочыя, просім партыю прыняць самыя рашучыя меры ў адносінах правай апазыцыі, якая перашкаджае нам будаваць сацыялізм.

Рабочыя, служачыя і тэхнічна-адміністрацыйны склад цукернай фабрыкі.

Як абслугоўваюцца дэмабілізаваныя Чырвонаармейцы

„НАЛЁТ" НА МЕНСКІЯ ЎСТАНОВЫ

Пасылка на работу ідзе пасьпяхова.--Няма належнай увагі культурна-бытавым абставінам

З 206 чырвонаармейцаў 156 атрымалі работу.—22 чал. пасланы на курсы ЦПП'у.—1.000 руб. на дапамогу.—Біржа добра наладзіла тэхніку работы.—Патрэбны сходы дэмабілізаваных.—Інтэрнат бяз лавак і сьвятла.—Ня бачаць газэт.—Вялікія «хвасты» ў сталоўцы.—Камісія, якая ня зьбіралася з 26 году.—Ячэйка Меншвею забылася пра сваіх новых работнікаў.

Што паказаў „налёт"

Рэдакцыяй газ. «Зьвязда» быў арганізаваны «налёт» па праверцы разьмяшчэньня на работу дэмабілізаваных у гэтым годзе чырвонаармейцаў. Ваенкораускімі групамі абсьледваны ўсе сэкцыі біржы і акруговая інспэкцыя працы, курсы ЦПП'у, камісія па пасылцы на работу начскладу, рэдакцыі газэт, інтэрнат, сталоўка і некалькі ўстаноў, куды пасланы дэмабілізаваныя.

Налёт паказаў, што разьмяшчэньне на работу дэмабілізаваных праходзіць з посьпехам. Месцы, якія вызваліліся ў сувязі з прызывам 1907 г., усюды ўлічаны і запоўнены дэмабілізаванымі. Асноўная маса, якая мае спэцыяльнасьць і працоўны стаж, ужо атрымала работу. Яшчэ знаходзяцца на вучоце ў абсалютнай большасьці тыя, якія ня маюць кваліфікацыі, а таксама сяляне, зьвязаныя са сваёй гаспадаркай, упяршыню сёлета прынятыя на вучот на агульных правах. З боку гэтай групы мы маем цэлы рад нічым неўгрунтаваных адмоў ад работы, напрыклад, нежаданьне ісьці ў калгасы, саўгасы і г. д., што тармозіць разгрузку біржы.

У гэтым годзе 22 чалавекі пасланы для атрыманьня кваліфікацыі на курсы ЦПП'у. Курсанты будаўнічага цэху, члены прафсаюзаў і тыя, якія маюць працоўны стаж, забясьпечваюцца спэндыямі або дапамогай з страхкасы і прафсаюзаў. Заслугоўвае ўвагі добрая тэхніка работы біржы працы. Акрвыканкомам выдзелены фонд у 1.000 руб. для аказаньня дапамогі дэмабілізаваным.

Гэта дасягненьні.

Буйным недахопам зьяўляецца слабая ўвага да матар'яльнага і культурнага абслугоўваньня дэмабілізаваных. Ня выканана пастанова камісіі садзеяньчаньня пры акрвыканкоме аб вызваленьні аднаго з начлежных дамоў для дэмабілізаваных. У камгасе аб гэтай пастанове нават ня ведаюць. Непарадкі ў сталоўцы і пакоі на 13 чалавек, адведзеным для дэмабілізаваных (які носіць гучную назву інтэрнату), зразумела, нічым не апраўдваюцца.

Слаба пастаўлена растлумачальная работа аб пэрспэктывах разьмяшчэньня, што цягне рад непаразуменьняў і адмоў ад работы, як, напрыклад, пытаньне аб часовай рабоце, якая не пазбаўляе чырвонаармейца права ў далейшым атрымаць работу па сваёй спэцыяльнасьці. За ўвесь час быў адзін сход дэмабілізаваных.

Ня выканана яшчэ пастанова камісіі аб пасылцы 50 чалавек у працкалектывы. Толькі што атрыманы весткі аб вакансіях у калгасах і саўгасах. Нельга не адзначыць, як недахоп, што на прадпрыемствах на дэмабілізаваных часта мала ўвагі зварачаюць парт'ячэйкі.

Нарэшце, нашы газэты зусім не займаліся пытаньнямі, зьвязанымі з дэмабілізацыяй.

Некалькі слоў аб дэмабілізаваным начскладзе. Існуючыя законапалажэньні і льготы (бронь) забясьпечылі параўнаўча пасьпяховае разьмяшчэньне начскладу.

Але гэта не работа акруговай камісіі. Яе, як такавой, фактычна ня існуе. Яна ня зьбіралася з 26 году. Усю работу праводзіў інспэктар працы і тэхнічны супрацоўнік. Камісія зусім не вывучала пытаньня аб становішчы начскладу, які пасланы на работу. 90 проц. яго мае зьніжэньне зарплаты супроць армейскай. Камісіяй гэтыя пытаньні ва ўсім аб'ёме ня ставіліся, хаця з боку раду ўстаноў было яўнае і нічым непрадтледжанае супроцьдзейнічаньне. Характэрна, што ў большасьці спасылаюцца на тое, што зарплата захоўваецца «па магчымасьці». Усё-ж меры для захаваньня гэтай магчымасьці, зразумела, далёка не скарыстаны.

Вось асноўныя вынікі «налёту».

Б. ПАПОЎ.

Разьмяшчэньне на работу ідзе пасьпяхова

За ўвесь час паслана дэмабілізаваных на работу 156 чалавек. Адносіны да дэмабілізаваных, трэба адзначыць, таварыскія, добрыя. Разумовая сэкцыя ўстанавіла для дэмабілізаваных спэцыяльны прыём тры разы ў тыдзень. На разумовай сэкцыі на 15-га лістапада ёсьць 26 чалавек. За час дэмабілізацыі было 16 момантаў пасылкі на работу.

Трэба адзначыць вельмі добрую пастаноўку справы па сэкцыі чорнарабочых. З 187, якія знаходзяцца на вучоце, паслана 46 чал. на пастаянныя работы і 76 паслана на часовыя, якія таксама маюць пэрспэктывы на тое, каб увайсьці ў штат. Шмат перашкаджаюць у рабоце чырвонаармейцы, па сацыяльным становішчы сяляне, якія ня зусім зацікаўлены ў рабоце. З іх боку шмат выпадкаў адмаўленьня ад работы. Старшыня, намесьнік і сакратар сэкцыі чорнарабочых заслугоўваюць таго, каб іх адзначыць на старонках «Зьвязды», як добрых работнікаў, што вельмі зацікаўлены дапамогай дэмабілізаваным. А вось дзеславод бібы Кіршынеўскі, аб якім у свой час пісалася ў часе чысткі апарату, замыкаецца ў рабоце, грубы, дзерзкі і бюракратычны.

ШВЭЦ, СУХАРУКАЎ і ПРОТЧАНКА.

Дэмабілізаваны начсклад разьмешчаны

З часу існаваньня Менскай акруговай камісіі па дапамозе дэмабілізаванаму начскладу (з 1-га кастрычніка 1926 году), паслана на работу 464 чалавекі.

На сёньняшні дзень усяго непасланых на работу — 5-6 чалавек.

Малодшы і сярэдні камсклад, раней дэмабілізаваны, які не падлягае дзеяньню камісіі, накіраваны апошняй на яго жаданьні на фізычную работу.

Трэба адзначыць, што камісія прымае ўсе меры, каб своячасова даць работу камскладу. Гэта пацьвердзілася з асабістых гутарак з тымі таварышамі, якіх камісія пасылала на работу. Праўда, часта маюць месца выпадкі зьніжэньня камскладу зарплаты супроць армейскай стаўкі, але гэта тлумачыцца тым, што ў інструкцыях няма належнай дакладнасьці ў гэтым пытаньні.

УЛАШЫНСКІ П.
САВІНІЧ А.

„Парадкі" ў інтэрнаце

У інтэрнаце дэмабілізаваных (па Камунальнай вул. № 18) ёсьць шмат такіх, якія ўжо даўно з армії, маюць пастаянную работу, а тым, хто дэмабілізаваны сёлета, не хапае месца і нават некаторыя валяюцца проста на падлозе. Гігіена ў памяшканьні зусім адсутнічае, усюды валяецца сьмяцьцё, павуціньне, вокны брудныя, пляваць ніадзе нямма. Здарылася гэта таму, што прыбіральшчыца прыходзіць раз у тры дні прыбіраць памяшканьне, а загадчык тав. Аляксееў ніякіх мер ня прымае.

На ўсё памяшканьне ёсьць толькі адзін стол, а зэдліка ні аднаго і таварышы садзяцца проста на ложках, дзе сьпяць. Культурная работы ніякай не вядзецца. Няма ні кніг, ні газэт. Дый і сьвятло ўжо адсутнічае два тыдні.

Пасьцельная бялізна знаходзіцца ў дрэнным становішчы, вельмі брудная. Мяняецца раз у месяц. Ня так даўно загадчык забраў брудную, а чыстай ня даў. Ёсьць такія таварышы, якія сьпяць нават без бялізны. Таксама няма рукамыйніка, баку для вады, па гарбату ходзяць у № полк, а часта і зусім застаюцца без яе.

БОГУШ і ЖУРОВІЧ.

Работу далі і супакоіліся

У Меншвэі ўсе месцы, якія вызваліліся ў сувязі з прызывам 1907 году, заняты дэмабілізаванымі чырвонаармейцамі. Гэта добра. Але дрэнна, што «трыкутнік» зусім забыў пра сваіх новых працаўнікоў і зусім не вядзе з імі ніякай работы, ня ўцягвае іх у грамадзкія арганізацыі. А іх 10 чалвек. Яны ня ведаюць парадкаў, многае ў жыцьці прадпрыемства ім яшчэ не зразумела. Таму дэмабілізаваныя адчуваюць сябе «чужымі». Адсутнасьць растлумачальнай і выхаваўчай работы нараджае рад недарэчнасьцяй і нават злосьць. Дэмабілізаваныя ня ведаюць сваіх пэрспэктыў і таму нездаволены сваёй работай. Далей хлопцы абураліся, што ім не даюць кватэр у будынку, між тым, калі ім растлумачылі, што гэты будынак жыльлёва-будаўнічай каапэрацыі, а не заводакіраўніцтва, яны супакоіліся. Незразумела, чаму дэмабілізаваным не даюць бялізны па талёнах адначасова з усімі пайшчыкамі МЦРК.

САЦУНКЕВІЧ.

Рэдакцыі стаяць у баку

Мы наведалі газэты «Савецкая Беларусь», «Рабочий», «Акцябр» і «Чырвоную Зьмену». Усе яны фактычна зусім ня ставілі на сваіх старонках пытаньня аб разьмяшчэньні на работу дэмабілізаваных і дапамозе ім, абмежаваўшыся гутаркамі т. т. Чарвякова, Галадзеда з чырвонаармейскімі дэлегацыямі.

Значна лепш абстаіць справа ў «Зьвязьдзе», якая дала прынцыповую ўстаноўку аб задачах у сувязі з дэмабілізацыяй і зьмясьціла 7 артыкулаў аб практыцы работы. Але і гэта, нам здаецца, невыстарчальна.

Лічым патрэбным адзначыць, што рэдактару «Савецкай Беларусі» ня варта сустракаць чырвонаармейскія брыгады словамі: «Няма зараз часу вазіцца з вамі».

* * *

На біржы працы ёсьць некаторыя дэмабілізаваныя, якія ўжо па 1 з паловай месяцы не атрымліваюць работы. Вельмі дрэнна абстаіць справа з кватэрны пытаньнем. Напрыклад, дэмабілізаваныя Мельнікаў і Казей ужо правялі дзьве ночы на станцыі, бо няма куды дзецца. За 1 з палов. месяца для дэмабілізаваных ні разу ня было лазьні.

Удзельнікі налёту БАЛАРЧЭНКА і ЯСЮЧЭНЯ.

„РУБЛЁМ І ДУБ'ЁМ"

З эпізодаў барацьбы за калгасы

За апошнія гады наш Лёзьнянскі раён (Віцебск. акр.) мае шмат яскравых фактаў вострай клясавай барацьбы паміж бядняцка-серадняцкай масай вёскі і кулацтвам. Гэта барацьба ў параўнаньні з іншымі раёнамі характарызуецца большай вострасьцю і жорсткасьцю, паколькі процант кулакоў у нашым раёне адносна большы, чым у іншых.

Калектывізацыя сельскай гаспадаркі —вось той галоўны пункт, вакол якога разгортваецца барацьба. Добра ўяўляючы, што калгасы ў корані падразаюць яго эканоміку, кулак мабілізуе ўсе свае сілы і сродкі, каб не дапусьціць арганізацыі калгасаў, або, калі ён ужо створаны, узарваць яго з сярэдзіны.

Для гэтай мэты кулакі вельмі часта вярбуюць асобных беднякоў, якія павінны быць іх агентамі і агітатарамі супроць калектывізацыі. У такіх выпадках кулакі дзейнічаюць і «рублём і дуб'ём», кідаючы дробныя падачкі асобным бедняком, або тэрарызуючы іх. Нам будзе карысным прасачыць за гэтай тактыкай кулака з тым, каб, лепш разумеючы яе, даць яшчэ больш жорсткі адпор дамаганьням кулацтва. Вось з гэтага пункту гледжаньня карысна ўважліва разгледзець тое, што мела месца ў Вяляшкавіцкім сельсавеце Лёзьнянскага раёну. Бядняцка-серадняцкі актыў сельсавету паставіў пытаньне аб стварэньні калгасу. Супроць яго арганізавана выступіла кулацкая група, якая ўвесь час вяла сыстэматычную антысавецкую работу. Гэта кулацкая група была зусім аформленай, са сваімі пэрыядычнымі сходамі, агітатарамі, арганізатарамі падкулачнікамі. Ядро яе складалася з індывідуальна ападаткаваных кулакоў і лішэнцаў Шляхценка Пархвен, Шляхценка Язэп, Алешчанка Т., Лазовікі Іван і Пятро. На працягу ўсяго чыя кампаніі і падарваць аўтарытэт савецкай улады сярод бядняцка-серадняцкіх мас. Усе члены групы—заядлыя ворагі Савецкай улады, якая ў 1917-18 г. адабрала ў іх буйныя маёнткі. Вось, напрыклад, Шляхценка Язэп—да рэвалюцыі ў яго было 275 дзесяцін зямлі, 6 сталых батракоў і ня менш 60 сазонных, вадзіны млын і шынок. Гэта—тып памешчыка-кулака. Зараз яму пакінулі толькі 33 дзес. зямлі і абклалі індывідуальным падаткам на 384 руб. Зразумела, што ён ня можа не ненавідзець беднаты і Савецкай улады—вінаўнікаў яго страт.

Кулакі Лазовікі, меўшыя да рэвалюцыі 52 дз. зямлі, сыны былога валаснога старшыні і правакатара (абложны індывідуальна ў 748 руб.).

Кулак Алешчанка Т.—заядлы чорна-соценец, пазбаўлены выбарчых праў, зямля якога (30 дзес.) зараз адыйшла пад калгас, а яму далі ў іншым месцы. Кулак Алешчанка проста заяўляе: «пакуль я жывы, калгас на маёй зямлі ня будзе».

Вось гэта кулацкая група, пры дапамозе падкулачнікаў паставіла сваёй мэтай ня даць арганізавацца калгасу і расправіцца з яго ініцыятарамі. Першым, на каго найбольш злосна наваліліся кулакі, быў т. Заявода—актывіст-настаўнік, селькор і энтузіясты калектывізацыі. У сваіх карэспандэнцыях у цэнтральныя газэты т. Заявода некалькі раз выкрывае работу кулацкай групы і дабіўся таго, што многія з іх былі пазбаўлены выбарчых праў. І вось пасьля гэтага на сваім сходзе кулакі ўхваляюць: «трэба прыбраць гэту калгасную свопач». Але, на гонар т. Заявода, ён не спалохаўся кулацкіх пагрозаў і дабіўся таго, што ніводзін кулак у калгас не ўвайшоў. Тады кулакі пачалі ўсялякімі спосабамі перашкаджаць нармальнай работе калгаса. Ім ня ўгодна, каб калгас быў арганізаваны, каб ён, калгас, ня ўзяў у свае рукі ўсю гаспадарку

Падпіска на „ЗЬВЯЗДУ“ па акругах складае ў адносінах да ліку членаў партарганізацыі:

Менская—87%, Мазырская—65%, Магілеўская—54%, Аршанская—51%, Бабруйская—46%, Полацкая—40%, Гомельская—32%, Віцебская—31%.

Трэба мець на ўвазе, што сюды ўваходзіць і падпіска **сярод беспартыйных**, установ, хат-чытален, каапэрацыйных аб'яднаньняў і інш.

Процант падпісчыкаў, які падае на партыйцаў, такім парадкам, зьніжаецца, прыкладна, на палову.

Гэта сьведчыць аб СЛАБАСЬЦІ работы ПА РАСПАЎСЮДЖАНЬНІ „ЗЬВЯЗДЫ“. Партарганізацыі павінны ЗАРАЗ-ЖА УЗМАЦНІЦЬ ГЭТУ РАБОТУ.

ДА ВЕДАМА ЖАДАЮЧЫХ ВУЧЫЦЦА НА ЗАВОЧНЫХ КУРСАХ МАРКСЫЗМУ

З 1-га лістапада па 1-га студзеня адкрыты новы набор на завочныя курсы марксызму. Кантынгент новага набору—2.000 чал.

1. Асноўнымі задачамі завочных курсаў марксызму зьяўляецца павышэньне тэарытычнага ўзроўню кіруючага актыву і выхаваньне ў ім звычак самастойнай работы. Тэрмін вучобы на курсах—3 гады. На працягу гэтага часу праходзяцца: гісторыя УсеКП(б), ленінізм, палітэканомія, эканомпалітыка і дыялектычны матар'ялізм. Вывучэньне ідзе не па падручніках, а па першакрыніцах марксыцкай тэорыі (Маркс, Энгельс, Ленін і інш.).

2. Навучальны плян курсаў разьлічаны па 10½ мес. з вызначэньнем на заняткі каля 50 гадз. у месяц. На працягу году завочнік павінен прапрацаваць 16 заданьняў з прадстаўленьнем ня менш 12 пісьмовых работ (разьмерам у 10—15 стар.).

Асновай вучобы зьяўляецца самастойная работа завочнікаў. Курсы кіруюць гэтай работай праз паведамленьне завочнікам праграм і заданьняў, кансультацыі па няясных пытаньнях, рэцэнзаваньне пісьмовых работ, праз навучальную дапамогу ва выпадак патрэбы на расійскай мове, праз арганізацыйна-мэтадычныя указаньні і г. д. Усе навучальныя матэрыялы курсантам не рассылаюцца, а друкуюцца ў часопісі «Завочныя курсы марксызму», выд. Дзяржвыдавецтва (падпіску робіць Дзяржвыдавецтва і яго мясцовыя органы).

3. На курсы прымаюцца члены партыі, якія падалі заявы аб прыёме з абавязацельствам захаваньня навучальнай дысцыпліны і з рэкамэндацыяй бюро ячэйкі.

Паступаючыя таварышы павінны ўладаць агульна-адукацыйнымі ведамі ня ніжэй школы 1-й ступені і палітпадрыхтоўкай ня ніжэй сав. парт. школы 2-й ступені.

Прыём кіруючага актыву (выкліканага на навучальныя канфэрэнцыі) робіцца праз мандатную камісію.

Завочнікі, што не прайшлі праз мандатную камісію (слухачы бяз выклікаў на канфэрэнцыю), могуць прымацца мандатнай камісіяй пры пераходзе з 1-га на 2-гі год вывучэньня (пры ўмове здачы за год устаноўленага мінімуму работ).

Мандатнай камісіяй, якая назначаецца ЦК УсеКП(б), прымаюцца кіруючыя работнікі ня ніжэй акруговага маштабу, якіх рэкамэндавалі бюро абласных камітэтаў партыі і якія маюць практыку ў кіруючай партыйна-грамадзкай рабоце і парстаж ня менш 7 год.

Мандатнай камісіяй, якая назначаецца ЦК УсеЛКСМ, прымаюцца кіруючыя камсамольскія работнікі ня ніжэй акруговага маштабу, рэкамэндаваныя бюро акруговых камітэтаў УсеЛКСМ з партстажам ня менш 2 год і стажам УсеЛКСМ ня менш 4 год. Разьвёрстак набору па мясцовых арганізацыях не ўстанаўляецца.

Таварышом, якія пачалі ўжо самастойна займацца па праграме курсаў і падалі першыя пісьмовыя работы, мандатная камісія робіць перавагі пры прыёме. Таварышы, якія не падалі першай работы, прымаюцца мандатнай камісіяй ўмоўна, з афармленьнем прыёму пасьля прадстаўленьня першай работы.

Для разгляду пытаньня аб прыёме трэба паведаміць наступныя даныя: прозьвішча, імя, па бацьку, узрост, нацыянальнасьць, асьвета агульная і палітычная,—сацыяльнае паходжэньне, прафэсія, пасада, практыка кіруючай работы, парстаж і нумар партбілету, стаж ЛКСМ, дакладны адрас (весткі павінны быць засьведчаны).

Таварышы, якія здавальняюча выконваюць заданьні курсаў, кожны год заклікаюцца на навучальныя канфэрэнцыі. Тэрмін канфэрэнцыі 4-6 тыдняў.

Курсы забясьпечваюць выкліканым на канфэрэнцыю таварышом пансіён (інтэрнат, харчаваньне). Мясцовыя арганізацыі даюць ім адпаведны водпуск (звыш чарговага) з захаваньнем утрыманьня і аплатай праезду.

4. Усе таварышы, што падалі заявы на курсы, павінны прыступаць да заняткаў, не чакаючы фармальнага пацьвярджэньня. Трэба безадкладна пасьля падачы заявы выпісаць часопіс «ЗКМ», выбраць прадмет і прыступіць да прапрацоўкі першай тэмы. Курсы аказваюць усім падаўшым заявы навучальную дапамогу, не чакаючы афармленьня прыёму, і будуць прад'яўляць да ўсіх падаўшых заявы навучальныя запатрабаваньні, выходзячы з тэрміну падачы заявы, а ня з тэрміну фармальнага прыёму. Усім таварышом, што выконваюць навучальныя заданьні завочных курсаў, камандзіраваўшыя арганізацыі павінны (згодна пастановы ЦК) забясьпечыць «тры разы ў тыдзень рабочы дзень ня больш чым 8 гадз.», або «звыш звычайнага дня адпачынку яшчэ 2-3 вольныя ад работы дні ў месяц выключна для самаадукацыі».

Таварышы, якія не працуюць на працягу двух месяцаў і не прадставілі свачасова засьведчанай парткомам спраўкі аб прычынах невыкананьня навучальных заданьняў, з завочных курсаў выключаюцца.

Усе таварышы, якія скончылі курсы марксызму па завочным аддзяленьні, атрымліваюць аб гэтым адпаведныя пасьведчаньні.

Беліцкая с.-гаспадарчая школа зусім не забясьпечана сродкамі

Ёсьць пагроза, што вучні не давучацца да канца году

(Беліцкая с.-гаспадарчая прафшкола)

Беліцкая сельска - гаспадарчая школа ўжо існуе чацьверты год. У першы год вучні перажылі вялікія труднасьці з памяшканьнем і харчаваньнем. Сёлета вучні таксама ня могуць нармальна займацца з-за недахвату харчаваньня. Ужо некалькі камісій разглядалі становішча школы і жыцьця вучняў, складалі акты аб тым, што школа мае патрэбу ў сродках для рамонту памяшканьняў і пабудовы сталоўкі. Апошняя камісія, якая складалася з прадстаўнікоў ЛКСМ, парасьветы і Наркамзему, абгледзела ўсю школу і знайшла, што тут ёсьць умовы для перабудовы школы на сямігодку і абяцала адпусьціць сродкі для абсталяваньня лябараторый і габінэтаў, але дагэтуль нічога ў гэтых адносінах ня робіцца.

Матар'яльнае забесьпячэньне вучняў зараз зусім дрэннае. Большасьць вучняў—батракі, рабочыя - калектывістыя, атрымаць прадуктаў на харчаваньне з боку няма адкуль, а стыпэндыя не забясьпечана. У гэтым навучальным годзе на стыпэндыі адпусьцілі такую суму грошай на 110 чалавек, як летась на 90 чалавек. Ёсьць пагроза, што вучні ня змогуць правучыцца ўвесь год.

М. К.

У сераду, 20 лістапада, а 8 гадз. увечары ў залі пасяджэньняў гарсавету адбудзецца

вечар, прысьвечаны адчыненьню курсаў вылучэнцаў пры ЦК КП(б)Б.

На адчыненьне курсаў запрашаюцца члены ЦК КП(б)Б, ЦКК, АК, АКК, ЦВК, СНК і ЦСПСБ, якія ўваходзяць па сваіх мандатах, іншыя па запрашальных білетах.

САВЕТ КУРСАЎ.

МЕНСК

Да 5-цігодзьдзя Туркменскай ССР

У сувязі з 10-цігодзьдзем існаваньня Туркменскай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі накіравана ўраду Туркменскай Рэспублікі ад імя ЦВК БССР тэлеграма за подпісам т.т. Чарвякова і Хацкевіча наступнага зьместу:

«Прэзыдыум ЦВК Беларускай ССР горача вітае рабочых, батрацтва і працоўных дэхкан Туркменскай ССР з пяцігодзьдзем не існаваньня. Адзначаючы значныя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва Савецкай Туркменіі за мінулы пэрыяд часу, прэзыдыум ЦВК БССР выказвае ўпэўненасьць, што ў цесным яднаньні з усімі сацыялістычнымі савецкімі рэспублікамі пад кіраўніцтвам кампартыі Савецкі Туркменістан будзе і ў далейшым з посьпехам разьвівацца на сацыялістычным шляху, зьяўляючыся верным аплотам Савецкага Саюзу ў глыбінях Азіі і правадніком ідэй камунізму сярод прыгнечаных народаў Усходу.

Беларускі трэст па апрацоўцы ільна-канаплянага сыру

Эканомнарада БССР прызнала мэтазгодным арганізаваць у БССР спэцыяльны трэст па апрацоўцы ільна-канаплянага сыру. Намячаецца арганізаваць адзін—два дасьледча-паказальныя ільнаводныя саўгасы, якія будуць служыць часткова базай для заводаў па першапачатковай апрацоўцы ільну.

Нэпманы і кулакі будуць плаціць за мэдычную дапамогу

Нядаўна ў газэтах «Зьвязда» і «Рабочий» быў зьмешчаны рад матар'ялаў аб тым, што органы аховы здароўя скрыўляюць клясавую лінію, у прыватнасьці, адзначалася, што кулакі і нэпманы карыстаюцца дармовай мэддапамогай. Гэта пытаньне абгаварыла нарада галоўных дактароў, загадчыкаў дзіцячых дамоў, кансультацый пры менскай інспэкцыі аховы здароўя. Нарада выказалася за правядзеньне цьвёрдай клясавай лініі ў справе аховы здароўя.

Нарада пастанавіла ў бліжэйшыя дні ўвесьці платнасьць за мэдычную дапамогу для непрацоўнага элемэнту.

Непрацоўны элемэнт падзелены на дзьве групы: да першай групы аднесены асобы, абкладзеныя індывідуальным падаткам, нэпманы, гандляры і лішэнцы, да другой групы—асобы, абкладзеныя падаткам з процантнай надбаўкай.

Для першай групы ўстаноўлена наступная аплата мэдычнай дапамогі: больнічны ложак—3 руб. у дзень, апэрацыя—хірургічная, гінекалёгічная, вочная—10 руб., амбуляторны прыём—50 кап., перавязка—50 кап., дробная апэрацыя—3 руб., рэнтгэнаўскі здымак—5 руб., прасьвечваньне—3 р., дапамога пры радох—10 руб. і г. д.

Для другой групы ўстаноўлена наступная плата: больнічны ложак—1 руб. у дзень, рэнтгэнаўскі здымак—2 руб., прасьвечваньне—1 руб., амбуляторны прыём—20 кап., перавязка—20 кап., дробная апэрацыя—1 руб. і г. д.

На Менскай акруговай канфэрэнцыі Асоавіяхіму

16-га лістапада ў клюбе суязі адчынілася Менская акруговая канфэрэнцыя Асоавіяхіму. На канфэрэнцыі прысутнічае 140 дэлегатаў. У першы дзень быў заслуханы даклад т. Дрылёнка (Цэнтральны Савет Асоавіяхіму) аб рабоце Асоавіяхіму ў Беларусі. У спрэчках па дакладу т. Дрылёнка запісалася 24 чал., выказалася ўсяго 13 чал.

17-га лістапада канфэрэнцыя заслухала справаздачу Менскага акруговага савету Асоавіяхіму, а ўвечары—даклад т. Рыжова аб міжнародным становішчы.

18-га лістапада адбудуцца перавыбары Менскага акруговага савету Асоавіяхіму.

Усебеларуская музычная нарада

У сярэдзіне сьнежня Галоўмастацтва склікае ўсебеларускую музычную нараду. Нарада абгаворыць пытаньні: сыстэма музычнай асьветы ў БССР, музычнае выхаваньне ў школе, музыка ў рабочым клюбе і хаце-чытальні і аб арганізацыі беларускай оперы.

Экспарт Беларускае кафлі ў Латвію

Беларускі трэст будаўнічых матар'ялаў заключыў першую зьдзелку на экспарт у Латвію 12-ці вагонаў кафлі прадукцыі беларускіх заводаў. Па водгуках латвійскіх фірм, беларуская кафля па сваёй якасьці ня ўступае нямецкай.

Суд

Шкоднікі з фабрыкі „Чырвоная Бярэзіна“

У лістападзе-сьнежні 1928 году на фабрыцы запалак «Чырвоная Бярэзіна» ў Барысаве мела месца вельмі частае псаваньне машын і розныя шкодныя зьявішчы: у варштаты падкідаліся мэталёвыя рэчы 1 г. д. Сьледствам было ўстаноўлена, што рабочы фанэрнага цэху Логвін Іван часта пакідаў цэх без належнага нагляду Гэты шкоднік пашыраў сярод рабочых думку, што многа працаваць ня трэба: «Стукнуў раз молатам і досыць». Ён часта зьяўляўся на фабрыку п'яным. Аднойчы ўлетку 1928 г. Логвін у п'яным выглядзе адкрыў у машыне вінціль, і толькі дзякуючы здагадлівасьці машыністага Сяліцкага, аварыя была папярэджана.

Увосень пасьля рамонту гідраўлічнага насосу здарылася аварыя. Было высьветлена, што вінаватым у гэтай аварыі зьяўляецца той-жа Логвін, які няправільна ўстанавіў клапаны.

Калі аднойчы папсавалася падзельная машына, Логвін прапанаваў спыніць яе для рамонту на 3 дні, што было роўназначна спыненьню ўсёй фабрыкі, між тым патрэбны рамонт быў зроблены на працягу 20 хвілін.

Акрамя шкодніцтва, Логвін займаўся і антысавецкай агітацыяй. На фабрыцы ён меў сваіх аднадумцаў. Мігуцкі Зьдзімер зьбіраў рабочых, вёў антысавецкую прапаганду, выступаў супроць мясцкому і ячэйкі, сарваў падпіску на пазыку індустрыялізацыі. Брат яго, Іван, дапамагаў гэтай шкодніцкай рабоце.

Усе памянёныя шкоднікі прыцягнуты да крымінальнай адказнасьці: Логвін па 59 арт. КК (падрыў дзяржаўнай прамысловасьці з контр-рэвалюцыйнымі мэтамі), Мігуцкі Зьдзімер—па 69 і 72-а арт. арт. КК.

Справу будзе разглядаць выязная сэсія Менскага акрсуду ў Барысаве 28-га лістапада. Па справе выклікана 16 сьведак.

А.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

— Фрунзаўскі РК МОПР'у выклікае на аўторак 19-XI, а 7-й гадзіне ўвечары ў РК (Савецкая 87) старшынь і сакратароў ячэек МОПР'у наступных ячэек:

Акадэміі Навук, Акрэо, Акрфа, абойнай ф-кі, арцель абутнікаў, арцель «Пралетары», арцель «Новы Шлях», арцель шорнікаў, арцель «Гаранашнік», Абкамтрэсту, Белгалоўпос, Белдзяржкіно, Белдзяржстрах, Белдзяржбуд, Белдзяржвыдавецтва, Белшклотрэсту, Белпайгандаль, Белхарчатрэсту, Белгандальбуд, Белмэдгандаль, Белшчаціна, Бюро даручэньняў, I саўбальніца, II саўбальніца, III саўбальніца, Водаканал, ВСНГБ, Галантарэйн. ф-ка, ГЭТ, Групком № 2 працасьветы, групком № 3 працасьветы, групком № 4 працасьветы, групком № 5 працасьветы, групком № 6 працасьветы, групком № 7 працасьветы.

З прычыны важнасьці пытаньняў яўка абавязкова.

Просьба зьявіцца своячасова.

Фрунзаўскі райком МОПР'у.

— Жанаддзел Кастрычнікавага райкому КП(б)Б заведамляе, што ў аўторак, 19 лістапада г. г. роўна а 7-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні клюбу Леніна (вул. Урыцкага, былая чырвоная заля) адбудзецца сход дэлегатак скліканьня 1929-30 году, які будзе працаваць пры райкоме.

Яўка ўсіх дэлегатак абавязкова і без спазьненьня.

Дом Камасьветы. Пры Доме Камасьветы арганізуюцца наступныя гурткі павышанага тыпу для актыву.

1. Па вывучэньні аграрнае праблемы і аграрнай палітыкі.
2. Па вывучэньні нацыянальнае праблемы і нацпалітыкі.
3. Гурток для партактыву судовасьледчых установаў.
4. Па вывучэньні праблемы «марксызм і прыродазнаўства».
5. Па вывучэньні гісторыі КП(б)Б і клясавага змаганьня на Беларусі.
6. Па вывучэньні ангельскай і нямецкай моў.

Запіс у гурткі ў канцылярыі Дому штодня ад 12—3 гадз. і ад 6 да 9 гадз. увечары.

Вячэрні рабочы унівэрсытэт. Даводзіцца да ведама студэнтаў 1-га курсу вячэрняга рабочага унівэрсытэту, якія працуюць у вячэрніх зьменах, аб тым, што дзённыя заняткі ў вячэрніх рабочым унівэрсытэце будуць праводзіцца з 11 да 2 гадз. дня: 1, 5, 6, 10, 11, 15, 16, 20, 21, 25, 26 і 30 числа кожнага месяца, у фізычным інстытуце БДУ.

БДУ. У панядзелак, 8-га лістапада, а 5 гадз. увечары ў габінэце рэктара адбудзецца пасяджэньне асьпірантскага бюро. На абвестцы—даклад т. Рыўліна аб пераглядзе праграм асьпірантаў усіх факультэтаў.

Запрашаюцца жадаючыя асьпіранты.

Клюб навуковых працаўнікоў. У сераду, 20-га лістапада а 9 гадз. увечары даклады прафэсароў Кроля і Бузука на тэму «Некаторыя ўражаньні аб паездзе за межы ў 1929 годзе».

Запрашаюцца навуковыя працаўнікі.

Пленум райкому МОПР'у Кастрычніцкара раёну адбудзецца 19-га лістапада, а 7 гадз. увечары з наступнай абвесткай дня:

Аб сацпаборніцтве, аб ходзе зімовае дапамогі, аб агляздзе ячэек і бягучыя справы.

Яўка абавязкова.

Жанаддзел Фрунзаўскага райкому заведамляе, што 21 лістапада, а 6-й гадз. увечары склікаецца нарада жанарганізатараў і кіраўнікоў дэлегацкіх сходаў.

Яўка абавязкова.

Рабселькоры пішуць

КЛЮБ БЕЗ КУЛЬТАСЬВЕТНАЙ РАБОТЫ

(Горы-Горкі)

Адзіным цэнтрам, дзе можна сканцэнтраваць усю масавую культасьветную і палітасьветную работу ў Горы-Горках, можа быць партыйна-прафэсыянальны клюб. Але ці выконвае ён свае задачы? Аб гэтым сьведчыць лепш за ўсё яго работа. Клюб займае досыць вялікі мураваны будынак. Але ўнутраны яго выгляд зусім не адпавядае клюбнай абстаноўцы. Замест чыстаты і цяпла, у клюбе пануе бруд, холад. Крэслы і лаўкі паламаныя. Поўная безгаспадарчасьць. У чытальні газэты раскіданы, часопісяй ніякіх няма. Вось такая абстаноўка на працягу цэлага раду год не змагла ня толькі прыцягнуць ні аднаго дарослага рабочага і служачага, а наадварот, адштурхнула маленькі асяродак людзей, якія наведвалі чытальню. Праўленьне клюбу зьбіраецца раз у год і то палова складу яго адсутнічае. Клюб не праводзіць ніякай палітасьветнай работы па чарговых задачах партыі. Ні аднаго працуючага гуртка, ні аднаго добра наладжанага вечару самадзейнасьці, ні аднаго чытача у чытальні, ніякай сувязі з вёскай і заўсёды зачынены пакой з «гучнамаўчалелем»—вось «творчая» работа Горацкага партпрафклюбу.

Была закуплена ў апошні час літаратура для бібліятэкі, але яна дагэтуль не распакавана. Беларускай літаратуры ў бібліятэчцы няма.

Зразумела, што гэткае становішча партпрафклюбу і адсутнасьць яго работы нельга далей цярпець. Кіруючым органам трэба зьвярнуць увагу на Горацкі партпрафклюб.

МЭМЗ.

Недысцыплінаваны элемэнт прызваць да парадку

(Менская, галянтарэйная фабрыка «Беларуска»)

Грубыя і нетактычныя адносіны з боку некаторых майстроў да рабочых на галянтарэйнай фабрыцы «Беларуска» досыць частае зьявішча.

Нядаўна майстар грабеннага цэху Раманоўскі накінуўся на рабочага: вылаяў яго самімі брыдкімі і нецэнзурнымі словамі і, вырваўшы з яго рук грабяні, кінуў іх на падлогу і пачаў таптаць.

Пра майстра Фурсэвіча ў друку пісалася ўжо. Гэта — грубіян і пратэкцыяніст. Ён нядаўна выжыў з фабрыкі маладога рабочага-сьлесара, які быў накіраваны на фабрыку біржай працы, а прыняў на яго месца аж двух «спэцаў» Нэймана і Іваноўскага па пратэкцыі. Яны зараз працуюць у мэханічным цэху ў якасьці сьлесароў, хаця ніколі раней па гэтай спэцыяльнасьці не працавалі. А калі прыходзіць кваліфікаваны сьлесары з біржы працы, то Фурсэвіч ім заяўляе:

— Вы тут працаваць ня здолееце.

Калі-ж усё такі той ці іншы рабочы, накіраваны з біржы працы, дабіваецца іспытаў, то Фурсэвіч у сярэдзіне работы, ня гледзячы на тое, што рабочы выконваў работу вельмі добра, падыходзіць і самым грубым спосабам вырывае з яго рук інструманты, кідае іх на падлогу, ды дадае:

— Вы свабодны...

Сьлесар Нэйман з рабочымі яўрэямі абыходзіцца надта вызываюча. У яго лексыконе антысэміцкія словы (як «жыд», «вінаваты ва ўсім жыды» і г. д.) — самыя ўлюбёныя і ходкія.

Акрамя гэтага нядаўна прыняты на фабрыку бяз біржы працы былы гандляр Пагоцкі, які працуе ў шліфавальным цэху.

Нельга абмінуць і таго, што на фабрыцы ёсьць факты безгаспадарчасьці. Так, напрыклад, выпісалі з Нямеччыны варштаты для шліфавальнага цэху, але іх зусім не скарысталі, бо яны не прыстасаваны да ўмоў работы. І вось, ня гледзячы на тое, што яны каштуюць вялікіх грошай, іх выставілі на двор на дождж.

Фрунзаўскі РК КП(б)Б для расьсьледваньня ўсіх ненармальнасьцяй, што ёсьць на фабрыцы «Беларуска», вылучыў камісію, але апошняя работы яшчэ не разгарнула.

А. НЕБАГАТЫ.

„Дажартаваўся“

Доўгі час вучнёўка (бронь) саўгасу Побалава Голад Хая была прадметам зьдзекаў з боку рабочага гэтага саўгасу Ліпскага Стася. Дзяўчынка Голад мае толькі 14 год. Круглая сірата. Гадавалася ў яўрэйскім дзіцячым доме. А пасьля трапіла ў саўгас Побалава. Яна была залічана ў якасьці броні і прымацавана да рабочага Ліпскага. Але, будучы яўным антысэмітам, Ліпскі ўчыняў над ёю самыя агідныя «жарты».

Калі Голад папрасіла Ліпскага напісаць заяву ў кіраўніцтва саўгасу аб тым, каб ёй далі водпуск, то Ліпскі, «жартуючы», зрэдагаваў гэтую заяву так: «прашу кіраўніка саўгасу Побалава даць мне водпуск з 1-га лістапада таму, што хачу замуж, я ўжо дзяўчына вялікая» і г. д. Карыстаючыся тым, што Голад малапісьменная, Ліпскі такую «заяву» даў ёй падпісаць і накіраваў у канцылярыю саўгасу. Ці варта ўжо спынялца на тым, што Ліпскі імем дзяўчынкі Голад ахрысьціў сучку і наогул рознымі антысэміцкімі зьдзекамі давёў яе да таго, што яна пачала ненавідзець сваю нацыю.

Ня гледзячы на тое, што Голад мае рад дадатных бакоў, Ліпскі распаўсюджваў пра яе розныя брудныя плёткі, у выніку чаго ўсе пачалі чічыць Голад распуснай дзяўчынкай.

Але вось зацікавіўся гэтай справай рабачком і даўёў да агульнага ведама рабочых. Рабочыя ў сваёй рэзалюцыі кваліфікавалі адносіны Ліпскага да Голад антысэміцкімі і адзначылі, што, як парт. і камсамольская ячэйкі, так рабачком і адміністрацыя зваячасова не рэагавалі на гэтае агіднае зьявішча ў саўгасе.

Рабочыя пастанавілі выключыць Ліпскага з членаў саюзу і прапанавалі адміністрацыі звольніць Ліпскага з працы, які сваімі паводзінамі кампрамэтаваў увесь рабочы калектыў.

САЎГАСАВЕЦ.

Ліст у рэдакцыю

Паважаны т. рэдактар!

Не адмоўце надрукаваць ніжэй падане:

Прашу ўсіх складальнікаў школьных падручнікаў і літаратурных зборнікаў, якія бяруць для памянёных кніг мае творы або ўрыўкі з маіх твораў, узгадняць гэта са мною.

Матывы: 1) Пры зьмяшчэньні твораў пісьменьніка складальнікі самі скарачаюць іх і перарабляюць. Пры гэтым псуюць твор як з боку стылю, так і з боку яго цэльнасьці.

2) Кожны раз, калі сам здаю ў друк свае творы (і раней друкаваныя), я іх нанава рэдагую, выпраўляю ранейшыя памылкі. Складальнікі зборнікаў адбіраюць у мяне гэту магчымасьць.

3) Пры зьмяшчэньні твораў складальнікі чытанак не выпраўляюць прапушчаных у аўтарскіх зборніках карэктарскіх памылак, а яшчэ дадаюць ад сябе новыя памылкі.

4) Калі складальнік камплектуе зборнік для пэўнага пытаньня, для пэўнай ударнай кампаніі ў сацыялістычным будаўніцтве, дык ён зноў-жа не ўзгадняе літаратурных матар'ялаў з аўтарамі. Я ў даным выпадку маю на ўвазе М. Сеўрука «Дзень ураджаю ў хаце-чытальні». У гэты зборнік трапіў урывак з маей паэмы «Чырвоны Каляндар» («Дзень ураджаю»), якая была надрукавана ў «Полымі» ў 1923 г.

Зусім слушна газ. «Зьвязда» і «Рабочий» зьвярнулі ўвагу на ідэалёгічныя памылкі ў гэтым вершы. Толькі справа ў тым, што гэты верш—толькі кавалак з паэмы «Чырвоны Каляндар». Калі ўзяць папярэдніх і пазьнейшых разьдзелах паэмы паказана галоўная кіруючая роля пралетарыяту ў рэвалюцыі і новым будаўніцтве, дык у малым урыўку («Дзень ураджаю»), дзе гаворыцца выключна аб сялянстве, гэта роля не паказана. Таксама ў вершы прапушчаны т. Сеўрукам карэктарскія памылкі і знакаў прыпынку, што зноў-жа зьмяняе сэнс.

Каб т. Сеўрук да мяне зьвярнуўся наконт зьмяшчэньня гэтага вершу, дык я бязумоўна не дазволіў-бы яго друкаваць у такім выглядзе. Трэба ведаць, што між днём ураджаю ў 1923 г. і 1929 г.—вялізны этап. Пры шпаркім тэмпе нашага сацыялістычнага будаўніцтва цяперашнія 6—ранейшыя 60 год.

З. БЯДУЛЯ.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

Кіно-тэатр „КУЛЬТУРА“ З панядзелка, 18 лістапада, мастацкі замежны фільм

ПРАЕКТ ІНЖЫНЭРА СТРОНГА

Рэжысэр РАЛЬФ-ІНС

У галоўных ролях: Джэк—СТРОНГ, Яго сястра—БЭРЫЛ, Эдвард БЭКЕР і інш.

ЗВЫШ ПРАГРАМЫ кіно-хроніка БЕЛДЗЯРЖКІНО:

1) Ударная брыгада чыгуначнікаў рыхтуе падарунак Кастрычніку.

2) Сьвяткаваньне XII гадавіны Кастрычніка ў Менску і ў Гомелі.

Пачатак 1-га сэансу а 7 гадзіне

КАСА—ад 5 гадз.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“ Ад панядзелка, 18 лістапада 2-гі ТЫДЗЕНЬ 2-гі выключны посьпех АМЭРЫКАНСКІ ФІЛЬМ

НЕБАСКРОБ

ЗВЫШ ПРАГРАМЫ кіно-хроніка „Совкино“ № 60

Навукова-Мэтад. Камітэт і Белдзяржвыдавецтва просяць усіх выкладчыкаў рабфакаў, вячэрняга рабочага унівэрсытэту, пэдтэхнікумаў і пэдкурсаў зьявіцца на пасяджэньне па пытаньні рэкамэндацыйных сьпісаў падручнікаў для адзначаных установаў

Пасяджэньне адбудзецца 19 лістапада а 7-й гадз. увечары ў памяшканьні НКА, пакой 9-10.

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ даставкі газэты „ЗЬВЯЗДА“ звяртацца па тэл. 2-49

50 к. Кошт публікацыі аб згубе дакумантаў

ЗЬВЯЗДА ФОТО-ЦЫНКАГРАФІЯ ПРЫМАЕ ЗАКАЗЫ НА КЛІШЭ МАСТАЦКАЕ ВЫКАНАНЬНЕ РЫСУНКАЎ

З ЗАКАЗАМІ ЗВАРОЧВАЦЦА У ГАЛОЎНУЮ КАНТОРУ ГАЗЭТЫ „ЗЬВЯЗДА“-МЕНСК, САВЕЦКАЯ, №63. 3ці ПАВЕРХ

ПАРТРЭТЫ, ГРАВЮРЫ, ПЛЯНЫ, СХЭМЫ, ФАКСІМІЛЬЕ, ЭТЫКЭТЫ, ЦЭННІКІ, ВОКАЛЬНЫЯ ВІНЬЕТКІ, РЭКЛЯМНЫЯ ПЛЯКАТЫ І ІНШЫЯ МАСТАЦКІЯ РАБОТЫ.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ“ СЁНЬНЯ і ШТОДЗЁННА папулярны комік БЭСТЭР КІТОН у амэрыканскай камэдыі

ГЕНЭРАЛ

у 7-мі частках.

Звыш праграмы КІНО-ХРОНІКА Совкіно № 64

1. Севастопаль: т. т. Сталін, Арджанікідзе і Варашылаў наведваюць Чорнаморскі флёт. 2. Агляд становішча сац. спаборніцтва ва Уладыкаўказе. 3. Хлебазагатоўкі ў Варонескай акрузе. 4. Ташкент: на акраіне гораду пабудаваны рабочы пасёлак.

Пачатак сэансаў а 7 гадз.

Каса—ад 5 г. 30 м.

1-ы дзіцячы кіно-тэатр «ЮНЫ ПІЯНЭР». (будынак кіно «Пралетары»). АД ПАНЯДЗЕЛКА, 18 ЛІСТАПАДА

ЖЫВЫЯ ДАМЫ

у 5 частках вытворчасьць БЕЛДЗЯРЖКІНО ЗВЫШ ПРАГРАМЫ ЦІКАВАЯ КАМЭДЫЯ

АДНА З ТЫХ, ЯКІХ ШМАТ

у 2 частках.

Каса адчынена штодзенна ад 2 гадз. дня.

Кіно „СПАРТАК“ СЁНЬНЯ, і штодзенна

ГАСТРОЛІ ФРЫНЫ КАЛЬЦОВАЙ, выканальніцы сьпеваў быту, сьпеваў народаў. Выключны рэпэртуар! На экране мастацкі бявэк У ГОРАД УВАХОДЗІЦЬ НЕЛЬГА

У гал. ролях А. М. Таідзе, Л. Л. Леанідаў, К. В. ЭГЕРТ. Пач. 1 с. аб г. 30 м. Каса ад 5 г.

ПАДПІШЫЦЕСЯ ЗАГАДЗЯ НА СЬНЕЖАНЬ НА ГАЗЭТУ „ЗЬВЯЗДА“

орган ЦК і Мен. АК КП(б)Б.

УМОВЫ ПАДПІСКІ: на 1 м.—90к., на 3м.—2 р. 60к., на 6 м.—5 р., на 1 г.—9 р. 75к.

«Зьвязда» дае сваім падпісчыкам дадаткамі на льготных умовах часопісы

БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ	Рабоче-Крестьянский КОРРЕСПОНДЕНТ	ОГОНЕК
1 м.—20 к. (замест 35 к.)	1 м.—25 к. (замест 30 к.)	1 м.—25 к. (замест 40 к.)

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА:

У Менску: Гал. к-рай гав. «Зьвязда», Савецкая, 63, ля ўпоўнаважанымі, газетным бюро і газэтаносцамі.

Па акругах: Упоўнаважанымі газэты «Зьвязда», кіёскамі т-ва Друку і ўсімі паштова-тэлеграфнымі канторамі.

СВАЯЧАСОВАЯ здача падпіскі ГАРАНТУЕ АКУРАТНУЮ І БЕСЬПЕРАПЫННУЮ ДАСТАЎКУ ГАЗЭТЫ.

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты да 2 гадзіны дня

Згубленыя і ўкрадзеныя наступныя дакуманты лічыць несапраўднымі

Вайсковая кніжка Сушынскага Л. П., выд. Пятрыкоўскім РВК. 257

Членск. кніжка саюзу нархарч Церло А. М. 258

Вучотна-конская кніжка Осіпава Б. 259

Вайсковае пасьведч. Пашака І. К., выд. Мен. ваенкаматам. 260

Каапэрац. кніжка № 2061 Сінеравіча І. А., выд. Мен. прыгародн. спажыв. т-вам «Земляроб» 261

Віза Крывіцкага І. К., выд. 15 пагранпо...

Пасьведч. Крывіцкага І. К., выд. Борынск. с-с.

Для здачы АБВЕСТКІ у газэту „ЗЬВЯЗДА“ звяртацца па тэл. 7-81